Зборы Беларушчыны.

# Ды-Джэй Адраджэньня



Унівэрсальны падручнік для прапаганды беларускасьці. Пасоб'е па беспрацоўі для пачынаючых патрыётаў.

МАЛАДОЕ АДРАДЖЭНЬНЕ

Менск, 1998

vytoki.net

vytoki.net



## ЧАГО ХОЧА МОЛАДЗЬ?

## ЯК ПРАВЕСЬЦІ DISCO?

## ЯК ЗРАБІЦЬ ШОЎ?

## ЯК АРГАНІЗАВАЦЬ КАНЦЭРТ?

## ЖЫВЫЯ ШОЎ

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ

## ПОПРОБУЙ БЕЗ ЯЗЫКА

## КАЛЕКЦЫЯ БЕЛАРУШЧЫНЫ

## КЛЮЧЫ, АДРЭСЫ, КАНТАКТЫ

## *ПРАЦЯГ БУДЗЕ!*

***НАСТУПНЫЯ ВЫДАНЬНІ "ЗБОРАЎ БЕЛАРУШЧЫНЫ"***

*2. Інтэлектуальныя гульні (тэксты віктарынаў, шоў, брэйнрынгаў, тэстаў)*

*3. Папулярная беларушчына (гісторыя, геаграфія, геалёгія, мова, кампутары, кухня)*

*4. Беларускі рок (рок-гурты,біяграфіі,хіты,тэксты й акорды)*

*5. Беларускі спорт (алімпійскія рэкорды, чэмпіёны, каманды.*

**Маладое Адраджэньне пляную скончыць выданьне сэрыі да 20 ліпеня 1999 г.**
**Замовіць усю сэрыю "ЗБ" можна праз тэлефон 249-92-47 (Вольга Анцыповіч).**

*Кніжка, якую Вы трымаеце ў сваіх руках — гэта другое пакаленьне "Збораў Беларушчыны". Першыя пяць рэдакцыяў "ЗБ" (некалькі тысячаў асобнікаў) былі выпушчаныя "Маладым Адраджэньнем" на грунце ўласнага досьведу 1996–97 гг., разыйшліся па ўсёй краіне ў 97–98 гг. і ўяўлялі сабою беларускія мэтадычкі для працы са школьнаю моладзьдзю.*

*"Зборы'98"— гэта першы ў Беларусі* ***ўнівэрсальны падручнік*** *беларушчыны, лякнічны й ёмісты канспэкт, выкладзены ў папулярным прыкладным ракурсе. Сучасная культура й легендарная гісторыя, беларускі рок і алімпійскія рэкорды, інтэлектуальныя гульні й беларуская кухня — гэта стратэгічныя прарывы беларускасьці ў найшырэйшыя плыні моладзьдзі. Гэта — ключавыя пытаньні маладзёвае культурнае палітыкі.*

*Унікальнасьць "Збораў" у тым, што тэмы для школьнікаў, студэнтаў, працоўных рыхтавалі самы маладыя. Гэта нашая казырная карта. Суб'ектыўная, слэнгавая й гумарыстычная стылізацыя — гэта, на наш пагляд, тая спэцыя, якой бракуе прафэсарскім ды прафэсійным выданьням.*

*Першы том "Збораў" — "Ды-джэй Адраджэньня" — зьяўляецца, бадай, сама важным з усяе сэрыі. Гэта азы. Асновы працы сярод школьнікаў і студэнтаў. Сьцісьлыя прынцыпы, альгарытмы працы, правілы й прыёмы прапаганды беларушчыны сярод сучасных падлеткаў ды моладзі. "Ды-джэй Адраджэньня" — кішэнная мэтадычка для маладога арганізатара, даведнік для настаўніка й выкладніка, каталёг папраўак для таго самага прафэсара. Калі Вы будзеце знаёміцца з наступнымі тамамі — "Інтэлектуальныя гульні", "Беларускі рок", "Беларускі спорт" і г.д. — Вам усё адно давядзецца пэрыядычна вяртацца да тома першага, да таго, ЯК ГЭТА РОБІЦЦА.*

*Аглядаючы ўвесь трохгадовы пэрыяд дзейнасьці "МА", прыходзіш да высновы: найлепшае, найцяплейшае, што запамінаецца й застаецца — гэта школьны газарт, захапленьне й абуджаная* ***любоў****. У прынцыпе, гэта ўсё, што трэба. Каб з Вас атрымаўся сапраўдны Ды-джэй Адраджэньня — пачытайце, як гэта робіцца.*

vytoki.net





# ДЭКЛЯРАЦЫЯ МАЛАДОГА АДРАДЖЭНЬНЯ

**"Маладое Адраджэньне"** — арганізацыя беларускае моладзі, якая выступае за Адраджэньне й разьвіцьцё сучаснае нацыянальнае культуры ў найшырэйшым сэнсе.

**Задача** "Маладога Адраджэньня" — у бліжэйшыя 3–4 гады зрабіць беларускую й эўрапейскую культуру найболыш моднай, папулярнай сярод моладзі.

**Мэтад** "Маладога Адраджэньня" — фармаваньне й падтрымка разнастайных асяродкаў мадэрновае, альтэрнатыўнае, нефармальнае беларускае культуры; наданьне наступальнага й відовішчнага характару працэсам беларусізацыі.

Нашая **дзейнасьць** — шоў, канцэрты, дыскатэкі, інтэлектуальныя конкурсы й экалягічныя віктарыны, інфармацыйныя праекты й кампутаровыя тэхналёгіі, мастацкія выставы й спартовыя спаборніцтвы.

Для нас **Беларусь — гэта сьвятое**.

## 7 ПРЫНЦЫПАЎ МАЛАДОГА АДРАДЖЭНЬНЯ

1. Нашая галоўная задача — выхаваць у эўрапейскасьці й беларушчыне хаця б адно пакаленьне маладых, і гэтае пакаленьне ста-

не непераадольным бар'ерам для любых імпэрыяў і дыктатураў.

2. Мы не павінныя гвалтоўна насаджаць, убіваць беларускае ў галовы. Трэба толькі далікатна й зацікаўлена крануць струны, нацыя ад нараджэньня ў кожнага тутэйшага — і чалавек загучыць сам.

3. Мы ня пнемся нацягваць сюды Эўропу, бы цёплую коўдру, мы ня мроім перанесьці Беларусь на тысячу кілямэтраў на Захад. Мы творым эўрапейскую Беларусь кожны на сваім месцы.

4. Мы змагаемся ня супраць Расеі ці Лукашэнкі, мы стаім за Беларусь.

5. Сапраўдны беларускі стыль — наступальны й відовішчны. Мы праводзім шумныя шоў, дыскатэкі, конкурсы, віктарыны з прызамі, ладзім клюбы ды сэкцыі. Мы даем актыўнае моладзі інфармацыю, музыку, спорт, і дасягаем свайго эфэктам і выгадай. Мы адкрытыя, яркія, выклiковыя, пасьміхаемся ўсімі зубамі. За намі ўся моц нацыі, гісторыі, краіны. Мы — Ды-джэі Адраджэньня!

6. Для МА важна як вялікае, так і сьмешнае, мы займаемся як масавай, так і элітнай культураю. МА вызнае і сур'ёзную навуковую дзейнасьць, і дасьціпны сьцёб, і вулічныя шоў, і дамашнія гурткі, і гульню, і працу.

7. Наш час — сёньня! Заўтра можа быць позна. Таму мы пачынаем зараз

## СТАНОВІШЧА

Мы пачынаем у складаных варунках. Сёньняшні нацыянальна-культурны стан беларускае моладзі можна акрэсьліць як становішча хворага пасьля зацяглага крызысу, калі неабходная інтэнсыўная тэрапія. Маладыя людзі дэзарыентаваныя, спрадвечныя чалавечыя каштоўнасьці ў заняпадзе. Расьце наркаманія, п'янства, злачыннасьць. Сыстэма беларускамоўнай адукацыі разгромленая.

Амаль уся моладзь, асабліва ў гарадох, размаўляе па-расейску. Расейскае тэлевізія, музыка, літаратура карыстаюцца папулярнасьцю нароўні з амэрыканскімі й эўрапейскімі ўзорамі. Беларушчына адчувальна прайграе ўсім тром замежным плыням: яна прысутная, але ў якасьці другога гатунку.

Тым ня менш, абсалютная большыня маладых беларусаў — за незалежную Беларусь. 2/3 школьнікаў і студэнтаў вызнаюць у якасьці палітычнага, эканамічнага й культуровага арыентыру Эўропу.

Нават у варунках рэжыму пасярод моладзі расьце попыт на ўсё беларускае. Стымулююць гэты пад'ём два асноўныя чыньнікі: з адн[illegible] ...ная прапанова беларушчыны

vytoki.net





ад нацыянальных сілаў; з другога, пастаяннае прыніжэньне нацыянальнае культуры расейскімі й афіцыёзнымі СМІ.

Варункі для разгортваньня шырокае прапаганды нацыянальнае адукацыі й культуры пасярод моладзі — унікальна найлепшыя ў параўнаньні з астатнімі ўзроставымі катэгорыямі. Высокі ўзровень сучаснае беларускае музыкі, літаратуры й мастацтва дазваляе разьвіць самую шырокую й разнабаковую дзейнасьць.

Справа — за Арганізацыяй.

## МАЛАДОЕ АДРАДЖЭНЬНЕ СЁНЬНЯ

На сёньняшні дзень МА мае ў сваім актыве каля сотні выступаў шоў-гуртоў зь віктарынамі й конкурсамі беларушчыны па школах, ПТВ і ВНУ, дзясяткі канцэртаў беларускіх рок-гуртоў, дзясяткі дыскатэкаў са спэцыяльнай праграмай (ад школьных да клюбных), некалькі праведзеных маладзёвых апытаньняў з колькасьцю рэспандэнтаў 500–1000 чал.; 5 перавыданьняў "Зборак Беларушчыны" (абсягам 30-50 старонак і агульным накладам больш за 3000 асобнікаў); некалькі буйных адукацыйных і культурніцкіх праектаў. МА прад-

стаўленая ініцыятыўнымі групамі ў Менску, Горадні, Магілеве, Лідзе, Віцебску, Наваполацку, Берасьці, Воршы, Маладэчне й іншых гарадох. Агулам гэта некалькі сотняў хлопцаў і дзяўчатаў, якія працуюць дзеля Адраджэньня. МА мае выхад у шырокую інфармацыйную прастору, дэпо досьведу й тэарэтычнага матар'ялу

Для ЦЯБЕ "Маладое Адраджэньне" — гэта магчымасьць раскрыцца ў творчасьці, набыць неабходны досьвед у працы з моладзьдзю й удасканаліцца самому..

## МАЛАДОЕ АДРАДЖЭНЬНЕ ЗАЎТРА

Ажыцьцяўленьне праграмы МА на тры наступныя гады ўлучае тры этапы:

I. Восень'98–лета'99.

— рэкляма Маладога Адраджэньня;

— арганізацыя сыстэмы пульсуючых мерапрыемстваў (шоў, дыскатэкаў, канцэртаў, конкурсаў) у найболыш спрыяльных і моцных нацыянальна-культурных маладзёвых асяродках;

— выданьне й распаўсюд пашыраных (да 70 стар.) "Збораў Беларушчыны" на беларускай, ангельскай ды расейскай мовах;

— падрыхтоўка вядучых, дыск-жакеяў і каардынатараў на спэцыяльных сэмінарах;

— стварэньне сыстэмы распаўсюду беларускае літаратуры, касэтаў і сымболікі;

II. Восень'99–лета'2000.

— інфармаваньне грамадзкасьці аб дзейнасьці МА;

— пашырэньне сыстэмы мерапрыемстваў на бальшыню гарадоў Беларусі, з упорам на нефармальныя аб'яднаньні, клюбы й тусоўкі;

— выданьне й распаўсюд спэцыялізаваных (для школаў, ВНУ, ПТВ) "Збораў Беларушчыны": у кожную навучальную ўстанову краіны — свой "Збор".

— наладжваньне выпуску бюлетэняў і выданьне касэтаў, зборнікаў і брашураў у галінах папулярнае музыкі, правапісу, экалёгіі.

III. Восень'2000–лета'2001.

— стварэньне сеткі мерапрыемстваў МА ува ўсіх раёнах Беларусі разам з узбуйненьнем рэгіянальных цэнтраў, функцыяваньне шэрагу клюбаў, канцэртавых і дыскатэчных кропак, рухавых шоў-гуртоў;

— шырокія праграмы падтрымкі творцаў;

— правядзеньне агульнабеларускіх сэмінараў, канфэрэнцыяў, асамблеяў;

— разгортваньне замежных праектаў і міжнародных кантактаў МА.

vytoki.net



## ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭНЬНЕ НАЦЫІ. ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ РАДЫКАЛІЗМ

Асьветніцкая й адукацыйная дзейнасьць ёсьць найгалоўнейшым
магістральным кірункам грамадзкага руху Малады Фронт. Мы паві-
нныя разумець: куды важней зацікавіць беларушчынай дзесяць школь-
нікаў, чым аддубасіць на дэманстрацыі сотню амонаўцаў. У выпадку
ўзмацненьня рэжыму Лукашэнкі культурніцкая праца павінная стаць
нашым сапраўдным Фронтам.

У абласных цэнтрах, мястэчках і вёсках мы ня можам арганізо-
ўваць такіх буйных акцыяў, як у Менску. Значыць, тут, у краёх, мы
павінныя перадусім перамагаць культураю! Памятайце: калі мы вы-
хаваем хаця б адно пакаленьне ў беларушчыне — мы атрымаем
самую грандыёзную перамогу за ўсе часы нашае шматпакутнае
гісторыі. Толькі такім чынам Беларусь стане сапраўды незалежнай і
моцнай, і ёй ня будуць страшныя ані лукашэнкі, ані газпромы й ра-
сейскія кіпцюры. Адно карэнным, глыбінным адраджэньнем куль-
турніцкай сьвядомасьці мы даб'емся стварэньня моцнай беларус-
кай нацыі. І ня думайце, што вашая праца — кропля ў моры. Калі
дружна возьмемся за справу — праз месяц вас будуць ведаць,
праз тры пра вас загавораць, праз 1.5-2 гады зьявяцца вынікі наша-
га пачыну па ўсёй краіне, і праз 3, самаболыш 4 гады — мы павінны
пераломваць расейскае панаваньне у культурніцкім жыцьці на ка-
рысьць беларускасьці і эўрапейскасьці.

Што трэба мяняць нацыянальна-вызвольнаму руху на сёньняшнім
этапе? Тактыку? Безумоўна, бо скандаваньні і палітычныя дэкляра-
цыі ўжо не праходзяць. Праграму? Бадай што так: на двары — эўра
й развал Расеі. Але сама важнае — вобраз дзеяньня. Вобраз жыць-
ця.

Сёньня, на зломе 3-га тысячагодзьдзя, грамадзкаму руху патрэб-
нае віртуальнае мысьленьне й рэактыўнае дзеяньне. Патрэбны
**інтэлектуальны радыкалізм**.

Яшчэ год таму паводле гэтых тэрмінаў — "інтэлектуалы" і "рады-
калы" — кваліфікавалі старэйшае пакаленьне фронтаўцаў. А між
тым і Сіўчык (адзін з сотні лепшых спэцыялістаў-эколягаў яшчэ пра
СССР), і Вячорка (вышталцоны мовазнаўца й унікальны камуніка-
тар), абазваныя радыкаламі, уяўлялі сабой той найноўшы тып лідара,
фронтаўца, які сёньня так востра неабходны й якога так баіцца рэ-
жым. Сьвежы, малады, тэхнічны, адначасова ідэоляг і выдатны прак-
тык, інтэлектуальны ў самым што ні ёсьць радыкальным сэнсе.

Нацыянальна-вызвольнаму руху патрэбнае другое дыханьне. Творчасьць, фантазія, відовішчнасьць, хуткасьць у інфармацыйнай і духоўнай сфэры. Нацыянальная ідэя павінная стаць здабыткам **масавае культуры**. Бо грамадзтва жыве зусім іншым жыцьцём, чым Фронт. Грамадзтва глядзіць тэлевізар да колікаў, працуе й вучыцца, штудыруе замежныя мовы й модныя кніжкі, балдзее ў навушніках, моліцца Богу, і між іншага, хварэе за Беларусь.

Патрэбныя магутныя духоўныя плыні, уласныя дасьледчыя інстытуты й народныя ўнівэрсытэты, рок-канцэрты й мнагатысячныя сьлевы, видэакліпы й алімпіяды, забаўляльныя газэты й музычныя радыёхвалі. БНФ, які гучыць па-ангельску як Popular Front, мусіць быць **папулярным**. Не палітычна гнуткім, не папулісцкім, а папулярным. Усё проста. Трэба дзейнічаць на два-тры хады наперад у тых напрамках, дзе рэжым не пасьпявае, задыхаецца. У стыхіях інтэлекту, тэхналёгіі, культуры, і асноўнае — у духоўнасьці, бо ў смутныя часы, якія надыходзяць, людзі інстынктыўна хапаюцца за простыя, чыстыя, сьвятыя рэчы.

Пара перастаць мысьліць катэгорыямі савецкай выторчасьці. Рабіць трагічны й па-геройску напужаны твар. Сапраўды, трэба быць папрасьцей — і людзі пацягнуцца. Пераможа той, хто шукае, хто просіць, хто грукаецца ўва ўсе дзьверы. Хто спадзяецца на лепшае й верыць у любоў, як гэта ня дзіўна. Той, хто сьмяецца — як Уленшпігель, Кола Бруньён і Юрась Братчык.

Ужо прайшлі вясна-96 і -97, калі вартасным эквівалентам змаганьня быў страх. Зараз адрэналін каштуе капейкі. У цане наш з вамі **час**, максымум **працы**, якую мы пасьпеем зрабіць да нейкай "гадзіны ікс". Сёньня ўсё вырашаюць дні й ночы мнагатысячнай чалавечай працы, нашых з вамі вучэньняў, чытаньняў, пісаньняў. Наша грамадзтва мусіць падымацца са споду.

Трэба прызнаць, што сёньня замест рэальных, здольных прыйсьці на зьмену рэжыму людзей (кіраўнікоў, адміністратараў, спэцыялістаў — аднаго чынавенства па ўсёй краіне патрабуецца дзясяткі тысячаў!) у апазыцыі існуюць абстрактныя схемы, увасабляць якія, напэўна, прызначаная старая добрая намэнклятура. Але патрэбныя ня толькі людзі. Праграмы, стопрацэнтова гатовыя да падключэньня. Кнігі выверанья да друку. Зьявы масавай культуры, тэлевізіі, радыё, прэсы, падрыхтаваныя да раскруткі. Сыстэмы кантактаў з замежжам — палітычных, эканамічных, культуровых...

Нацыянальна-вызвольнаму руху даўно трэба працаваць не на сябе.
Шт … кожны бомж. Трэба думаць не

vytoki.net





*Ладзіць Шоў Беларушчыны — гэта вам не машыны куляць!*

пра імідж, рэйтынг, не пра гадасьці, якія мы зробім гэтым уладам, а пра рэальныя патрэбы беларускага **народа**. Не пра сто тысячаў на плошчы Незалежнасьці, а пра сто тысячаў будучых беларускіх падручнікаў. Не пра размовы Шродэра з Лукашэнкам, а пра свае стасункі з тымі ж самымі нямецкімі палітыкамі, фінансыстамі, навукоўцамі. Нам зараз даюць працаваць над памылкамі 1992–1995 гг., а мы кожнага дня выкопваем пасаджанае семачка й зьдзіўляемся, чаму анічога так і не вырасла.

Цяжка ўспрыняць, але гэта так: усякая ўлада ад Бога, і лукашэнкаўская ў тым ліку. Менавіта яна пад кананаду сваёй правальнай палітыкі дае нам цудоўны шанец прывесьці сябе ў парадак, падрыхтавацца да таго, што будзе пасьля, і не выглядаць матросамі ў Зімнім. А пакуль мы ня будзем гатовыя — гл. 1995 г.: Лукашэнка, як і Расея, з гэтага месца ня сыйдуць.

Фронт не павінны існаваць як апазыцыі ці кардон. Фронт мусіць выканаць місію стваральніка **альтэрнатыўнага грамадзтва** — таго, у якім ані дыктатуры, ані Расейскай імпэрыі ня будзе месца. Няправільна аб'ядноўваць нацыю **супраць** кагосьці. Прынцып кансалідацыі мае на ўвазе **ЗА**.

Сёньня Фронту трэба мець сьмеласьць адмовіцца ад гневу, помсты, нянавісьці. Ад люстрацыяў, якія няўмольна цягнуць за сабой індульгенцыі, чорных сьпісаў і астатніх варфаламееўскіх штучак. Інакш нічога сьвятога ў нас з вамі не застанецца. Трэба ўспомніць пра Веру, Надзею, Любоў. Успомніць пра тое, што мы — Духоўны Фронт, Беларускае Адраджэньне. Трэба выклікаць да грамадзкага жыцьця наймагутнейшую сілу **хрысьціянства**. Інакш застаецца дзейнічаць мэтадамі рэжыму. Ці — па сцэнарах расейскай папсы з малінавымі сьпінжакамі й пірамідамі на тры літары.

Мы з вамі здольныя. Мы можам. Змаглі ж калісьці насуперак усім пачаць размаўляць па-беларуску. Змаглі ж, як гэта не было цяжка стаяць на сваім усе доўгія дзесяць гадоў. І на гэты раз сябе перасілім, паверце, здолеем.

**Цяпер — пяць галоўных прынцыпаў працы ў сёньняшніх нашых варунках.**

**1. Займайцеся лепшымі. Толькі праз іх мы здабудзем масавасьць!**

Бальшыня моладзі — школьнікаў і студэнтаў — усё роўна заўтра не загаворыць па-беларуску. Нашая задача — накрыпаць беларушчынай маладзёвую **эліту**: найразумнейшых, дасьведчаных, "пэрспэктыўных" — будучыя вяршкі нацыі. Прыкладам, падчас школьных віктарынаў нашага шоў-гурта з клясы ў 25-30 чалавек вылучаюцца трое-чацьвёра найбольш актыўных хлопцаў і дзяўчат — яны й ёсьць будучыя "вяршкі грамадзтва". Такім маладым людзям выдаюцца прызы-заахвочваньні: кніжкі, газэты, касэта зь беларускімі запісамі. Лепш за ўсё трымаць з гэтымі "актывістамі" трывалае знаёмства, прапаноўваць ім нашыя канцэрты, дыскатэкі, відовішчы і сьвяты, усяляк завязваць на беларускую элітную культуру. Гэта вельмі карысны й прыемны занятак, праз які вы самі набываеце цудоўных сяброў, добры настрой і неацэнны досьвед камунікацыйнае працы.

**2. Будзьце практычнымі й мадэрновымі! Моладзі трэба эфэкт, відовішча, выгада.**

Зараз, калі разумная моладзь ужо спазнала якасьці эўрапейскай і амэрыканскай цывілізацыі, вы яе не завабіце ў беларушчыну траваядным гістарычным гуртком альбо цхамірнай кружэлкай Данчыка. Актыўная, рухавая, **лідэрская** моладзь, якая нам патрэбная, прагне року, дыскатэкаў, якасных і інфарматыўных кнігаў, эфэктоўнага спор[...] [...]умныя, яркія шоў, сьвяты, пра-

vytoki.net





*Вечаровы вулічны карнавал "Беларусь у Эўропу!"*

водзіць конкурсы і анкетаваньні (дзеля высьвятленьня патрэбаў і поглядаў моладзі, і дзеля рэклямы), віктарыны зь недарагімі, але карыснымі прызамі, ладзіць клюбы й спартовыя сэкцыі. Парайцеся з Фронтам наконт арганізацыйных магчымасьцяў і патрабуйце ад "старафронтаўцаў" патрэбнае дапамогі; мы ж маем матар'ялы й тэхналёгіі. І крый вас Бог засяроджвацца на традыцыйных пытаньнях мовы, літаратуры, старасьвеччыны,— граблях, аб якія расшыб сабе лоб БНФ. Для моладзі сёньня першачарговае значэньне маюць цікавая інфармацыя, музыка, відовішчы, спорт.

**3. Вы мусіце быць прыкладам для іншае моладзі, а не апускацца да яе ўзроўню.**

Ветлівы, дасьведчаны, гаваркі малады чалавек — **цэнтар** прыцягненьня для равесьнікаў. Чыстых, сумленных і разумных паважаюць людзі і баіцца хамская ўлада. У вас бліскучыя шанцы на посьпех, калі вы ня злоўжываеце вядомымі напоямі й тытунём, займаецеся спортам, і ўмееце ўсё рабіць лепей за іншых. Будзьце ўпэўненыя — моладзь падсьвядома падцягваецца да вашага ўзроўню. Беларуская мова, на якой вы размаўляеце, стане для іх не "дзеравенскім

языком", а выдатнай азнакай культурнага чалавека. Дарэчы, аб мове: проста неабходна зараз ужываць **тарашкевіцу** альбо, на ваш густ, лацінку: гэта нашыя казырныя карты. Даведка: сучасны тарашкевіцкі правапіс выдатна выкладзены на 40 старонках Вінцуком Вячоркам (часопіс "Спадчына", №5 за 1995 г. Культурніцкі Аддзел плянуе хутка выдаць тарашкевіцу асобнай брашураю).

**4. Наступальнасьць беларускага стылю.**

Беларускі стыль наступае ды выйграе. Мы павінны паказваць гэта моладзі ўсім сваім упэўненым выглядам. NRM сьпявае: "большасьць за тых, хто пераможа!" — і мае абсалютовую рацыю. Ніякага хаваньня па кутках, занурэньня ў падзем'е, ніякіх комплексаў зацкаванага, што цябе "не поймут" ці "поднимут на смех". Ты — на сваёй зямлі! За табою — уся моц гісторыі, нацыі, краіны! Будзь адкрытым, яркім, нахабным, пасьміхайся ўсімі зубамі. Насі беларускасьць нараспхрыст — выклікова, нават агрэсіўна: так, Я — стылёвы беларус! Гавары гучней, перабірай сакавітымі беларускімі слоўцамі — маладыя захапляюцца няўжарт. Будзь Ды-джэем Адраджэньня!

**5. Найважнейшае — Вера, Надзея, Любоў.**

Памятайце, што ніхто ніколі не здабываў сьвятога праз гнеў, гвалт, нянавісьць. Толькі дабрынёй, ласкай, сьмехам мы падымем гэтую краіну. Нашая моц — у веры. Нашая магутнасьць — у духу.

Будзьце простымі й мудрымі, як Эвангельле.

Урэшце, найлепшы наш "Малы кансьпіратар" — гэта Біблія. Пачытайце, як прапаведвалі Хрыстос і апосталы, і Вы зразумееце, ЯК ГЭТА РОБІЦЦА.

vytoki.net



# ВАРТА ВЕДАЦЬ

У 1997 г. "Маладое Адраджэньне" правяло шэраг сацыялягічных апытаньняў у асяродзьдзі сталічнае моладзі (ад 500 да 1000 чалавек, у адпаведнасьці са стандартамі). Вынікі аказаліся нечаканымі для нас, і істотна зьмянілі нашае ўяўленьне пра гледзішчы й жаданьні маладых менчукоў. Нам здавалася, што большасьць зь іх ставіцца да беларушчыны калі не варожа, дык абыякава. Але вось найбольш цікавыя факты:

Пытаньне: "Якую сымболіку Вы лічыце сваёй?"

| Варыянты | Школьнікі | Студэнты | Агулам |
|---|---|---|---|
| Нацыянальную: бел-чырвона-белы сьцяг і "Пагоню" | 82,92% | 67,22% | 73,8% |
| Лукашэнкаўскую | 9,76% | 14,28% | 12,39% |
| Іншую ці ніякую | 7,31% | 18,48% | 13,8% |

Зьвярніце ўвагу: сярод школьнікаў лікі значна вышэйшыя, чымсьці сярод студэнтаў. Мала таго, студэнты куды больш абыякавыя да такога кранальнага пытаньня. Гэта відавочны разлом пакаленьняў: **студэнцтва**, якое выйшла з савецкага саюзу, піянэрыі й камсамолу, ды **школьніцтва**, якое ўдыхнула свабоды напачатку 90-х. Зважайце: нягледзячы на шалёную прапаганду чырвона-зялёных сымбаляў, нацыянальныя сьцяг і герб у шэсьць (!) разоў больш папулярныя. Гэта абсалютная апазыцыя.

Пытаньне: "Як Вы ставіцеся да аб'яднаньня з Расеяй?"

| Стаўленьне | Школьнікі | Студэнты | Агулам |
|---|---|---|---|
| Адмоўна | 68,2% | 54,62% | 62,87% |
| Станоўча | 18,29% | 33,61% | 27,57% |
| Абыякава | 13,41% | 10,76% | 11,9% |

Бачыце, зноўку тая ж раскладка, школьнікі — радыкальныя прыхільнікі незалежнасьці; зрэшты й сярод студэнтаў незалежнікаў значна больш.

А вось сама паражальны эфэкт: узроставае разьмеркаваньне гэтага пытаньня:

| Узрост | Адмоўна | Станоўча |
|---|---|---|
| 14 | 73,53% | 14,7% |
| 15 | 72% | 16,66% |
| 16 | 74,07 | 11,11% |
| 17 | 40,47% | 39% |
| 18 | 60,56% | 32,39% |
| 19 | 61,9% | 33,3% |

Пагледзіце, дзе праведзеная тлустая лінія! Паміж 16- ды 17-гадовымі — сацыялягічна аграмадны разлом у 33%! Гэта якраз-такі мяжа студэнцтва й школьніцтва, пэрыяд паступленьня ў ВНУ. Гляньце, як адразу 17-гадовыя робяцца асьцярожнымі й палахлівымі. Гэта вынік негалоснага ўціску, псыхалягічнага тэрору ў студэнцкіх асяродках з боку адміністрацыі й карных органаў, боязь быць выключанымі з унівэрсытэту. Суцэльны першы курс у правале. На II, III курсах паказьнікі рэзка, на 15-20% падвышаюцца. Маладыя асвойваюцца.

Зрэшты, могуць існаваць іншыя тлумачэньні гэтага факту.

Невялікае, але пікантнае ўдакладненьне: лікі пасярод асобаў жаночага ды мужчынскага полаў:

| Катэгорыя | Адмоўна | Станоўча |
|---|---|---|
| Дзяўчаты | 61,69% | 30,52% |
| Хлопцы | 64,4% | 23,73% |

Як бачыце, хлопчыкі трохі больш дасьведчаныя. Калі ў іх перавага незалежнікаў над "залежнікамі" 3:1, дык у дзяўчатаў яна скарачаецца да 2:1. Гэта пацьвярджае шматлікія "дарослыя" дасьледваньні, якія аднадушна акрэсьліваюць бальшыню электарату Лукашэнкі як жаночую. Усё-такі жанчынам ён падабаецца.

Пытаньне: Што, на Вашую думку, павінна быць палітычным і эка-

н

vytoki.net



| Арыентыр | Агулам | Школьнікі | Студэнты |
|---|---|---|---|
| Расея | 8,57% | 1,21%(!) | 13,44% |
| Эўропа | 69,52% | 71,95% | 68,06% |
| ЗША | 5,71% | 8,53% | 3,36% |
| Іншае | 16,19% | 18,29 | 15,29% |

У першую чаргу ўражвае, як мала прыхільнікаў Расеі сярод школьнікаў — у 11 разоў менш, чымсьці ў студэнтаў. Можна меркаваць, што пасьля апошніх расейскіх крызысаў такіх арыгіналаў засталіся адзінкі.

І — бясспрэчная падтрымка Эўропы. Упершыню студэнты й школьнікі адказвалі дружна, салідарна й амаль хорам: 68-69%!

Таксама цікава, што амэрыканцы пераважаюць у школьнікаў. Мабыць, яны проста глядзяць болей Галівуду.

Наступнае апытаньне больш прадметна тычылася беларушчыны. Паводле вынікаў апытаньня №3,— як бы вы пажадалі правесьці вольны час **ў беларускім стылі**? — былі атрыманыя наступныя адказы:

38 адсоткаў абралі беларускую ДЫСКАТЭКУ

35% — ШОЎ, КОНКУРСЫ, ВІКТАРЫНЫ беларушчыны

13% — СЭМІНАРЫ Й ЛЕКЦЫІ

11% — ПАТРЫЯТЫЧНА-СПАРТОВЫЯ СЭКЦЫІ

4% — беларускі ТЭАТАР

3% — пасядзелі б у беларускім ПІЎБАРЫ

Абсалютовая перавага — у першых дзьвюх намінацыях: а гэта менавіта той кірунак, у якім дзейнічае "Маладое Адраджэньне"!

71% — згадалі, што для іх беларускае, беларушчына — гэта "важная галіна ведаў", а каля 5% гатовыя нават прысьвяціць нацыянальнай культуры жыцьцё.

Толькі крыху больш за 7% маладзёнаў назвалі беларушчыну "чем-то малоинтересным".

Урэшце, на пытаньне "Каму зь вялікіх беларусаў вы паставілі б помнік на пляцы Незалежнасьці", адказы разьмеркаваліся так: Скарына — 32%, Купала — 7%, Каліноўскі ды Эўфрасіньня Полацкая — па 6%, Вітаўт Вялікі — 5%, Колас — 4%, Багдановіч — 3%.

Але не трапілі ў рэйтынг Альгерд, Радзівілы, Астроскі й Хадкевіч: высновы рабіце самі.

Некалькі заўвагаў. Першае. У школьнікаў паказьнікі беларускасьці

значна вышэйшыя. Студэнты саступаюць ім амаль па ўсіх пазыцыях. Высновы: аддавайце больш увагі **школе** — яна нашая,— і больш тонка працуйце ў ВНУ.

Другое. Нягледзячы на параўнальна высокія паказьнікі нацыянальна-палітычнае сьвядомасьці, сучасная беларуская рок-музыка, вартая беларуская літаратура, сапраўдная гісторыя, цудоўная мова й геніяльнае мастацтва амаль што невядомыя сярод студэнтаў ды школьнікаў. Усяго некалькі адсоткаў цалкам дасьведчаныя ў гэтых пытаньнях. Склалася парадаксальнае становішча: маладыя **гатовыя** да ўспрыманьня беларушчыны. Яны хочуць пачуць і пабачыць яе, але ж гэты **попыт не задавальняецца**. Моладзь не спазнала яшчэ Беларусі. Цяпер найпершая наша задача — даць студэнтам, школьнікам ды іншым маладзёвым асяродкам лепшыя ўзоры беларускага року, навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры, усе лепшыя праявы беларушчыны. Яе чакаюць! Надыйшоў час дзеяў.

vytoki.net



# ЯК ГЭТА РОБІЦЦА

У вашай радзе ці суполцы весьці культуру й ладзіць відовішчы павінны **асобны** чалавек, які й падбірае сабе каманду: **шоўмэна**, **кніжніка**, гісторыка й мовазнаўцу, **ды-джэя** і г.д. Гэтая адказная асоба мусіць быць прынамсі намесьнікам старшыні ці нават займаць пасаду старшыні суполкі, бо яшчэ раз паўторымся, — мы пераможам культураю. Ня звальвайце культурніцкую справу на адных дзяўчат! У самоце яны могуць ня выцягнуць гэты сама адказны, сама плённы й пэрспэктыўны кірунак дзейнасьці.

Суполка "Маладога Адраджэньня" — гэта агмень беларушчыны ў вашай мясцовасьці. Таму яна мусіць выконваць ключавыя 4 задачы:

Першая, **інфармацыйная**: пільнаваць культурніцкае становішча, фіксаваць усе праявы беларушчыны, назапашваць і захоўваць інфармацыю і, зразумела, мець набор з пэўных кнігаў, касэтаў, газэтаў і г.д.

Другая, **арганізацыйная**: відовішчнымі й эфэктыўнымі акцыямі абуджаць беларушчыну ў тутэйшых маладзёвых асяродках: ладзіць дыскатэкі, канцэрты, конкурсы, брэйн-рынгі, экскурсіі, гурткі дый інш.

Трэцяя, **нутраная**: для сваіх сябраў — вечарыны, краязнаўчыя паходы, экалягічныя экспэдыцыі, сьвяткаваньні беларускіх нацыянальных сьвятаў і г.д.

Чацьвёртая, **творчая**: падтрымліваць маладых беларускіх творцаў — паэтаў, музыкаў, мастакоў, якія ёсьць у вашай мясцовасьці.

Выдатны прыём — **афіцыйна зарэгістраваць** грамадзкую арганізацыю (студэнцкі клюб, фан-клюб "NRM", краязнаўчы гурток альбо нешта падобнае). Гэта ймгненна пашырыць магчымасьці для працы, часткова абароніць ад уціску. Зьявяцца шанцы нешта арэндаваць, атрымліваць гранты дабрачынных фондаў. Вам дапаможа Фронт, сьвядомыя журналісты, іншыя патрыёты. Можна чыніць і "як ёсьць" — аднак будзьце асьцярожныя з грашовым пытаньнем: распаўсюд касэтаў будзе ў вас абменам, продаж кніжак абярнецца ў падарункі, квіткі на дыскатэку будуць удзячнасьцю за адлаведны ўнёсак у касу суполкі і г.д.

Па магчымасьці выкарыстоўвайце ў сваёй дзейнасьці структуры БПСМ, падлеглыя нашаму ўплыву (гэта не фантастыка — туды зганяюць каго толькі могуць). Праз іх можна ставіць дыскатэкі, замаўляць залі, памнажаць нашыя матар'ялы, і г.д.

Такім чынам, падрабязныя парады — як справіцца з разьвязаньнем нашых чатырох задачаў.



Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
Fond 1122 dziela № 87

## 1. ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЗАДАЧА

Першае, што вам трэба зрабіць — гэта **адшукаць** у вашай мясцовасьці маладых і сталых адраджэнцаў, **тых, хто ўжо займаецца беларушчынай** (журналісты, дырэктары музэяў, настаўнікі, бібліятэкары, сябры ТБМ, мастакі), і навязаць зь імі прыязныя і спраўныя стасункі. Гэтыя людзі — наша надзейнае апірышча. Праз іх можна весьці ільвіную долю нашае праграмы — выступы, канцэрты, дыскатэкі й г.д. Каб знайсьці іх, распытайце старэйшых фронтаўцаў, сваякоў, знаёмцаў. Абавязкова пераглядзіце **падшыўкі** мясцовае прэсы — хто піша пра беларускае? Дзе адчыніўся беларускі музэй? Хто фундаваў беларускую выставу? — і занатуйце, выпішыце ўсё, што вам патрэбна. Наведайце знойдзеныя асяродкі беларушчыны. Прапануйце гэтым шчырым беларусам наша "Маладое Адраджэньне", аднак не перавальвайце ўсе нашыя клопаты на старэйшае пакаленьне. Калі вы можаце чымсьці дапамагчы таму ж музэю, бібліятэцы ці школцы (перанесьці кнігі, раскласьці экспанаты, узяць удзел у раскопах) — неадменна зрабіце гэта. Выгада будзе абаетнай.

Кожнай суполцы ці Радзе абавязкова трэба весьці ўласны **культурніцкі архіў**: сабраныя кнігі, публікацыі й вашы ўласныя сьведчаньні зь гісторыі краю, прыроды, тапанімікі, археалёгіі. Найбольш надзённыя, актуальныя матар'ялы адразу ж дасылайце ў свой абласны цэнтар тамтэйшаму каардынатару альбо — наўпрост у Менск. Мы зможам даць ход важкім фактам і допісам, апублікаваць вашы цікавыя дасьледваньні ў навуковых, папулярных і культурніцкіх выданьнях.

І ўрэшце, вашая рада ці суполка павінна мець "джэнтэльмэнскі набор" беларушчыны — літаратуру, аўдыёзапісы, падшыўкі. Прыкладны сьпіс пад назваю **"Калекцыя Беларушчыны"** (з 30-ці кнігаў, 20-ці касэтаў ды некалькіх зборааў) паглядзіце далей. Гэта — найбольш эфэктыўная агітацыя падчас выступаў перад аўдыторыяй. Зьбярыце сваю калекцыю сярод сяброў, у крамах ці бібліятэках. Калі нечага ня знойдзеце — замаўляйце ў Менску на адзначаных у "Ключах" адрэсах.

## 2. АРГАНІЗАЦЫЯ ВІДОВІШЧАЎ.

Арганізацыя відовішчаў для школьнікаў, студэнтаў і працоўнае моладзі ёсьць нашай найгалоўнейшай, найбольш вялікай і працаёмістай задачай. Калі раскруцяцца канцэрты, конкурсы й дыскатэкі — мы масава ахопім маладзёвы рух. Калі гэтага ня будзе — астатнія нашы намаганьні пойдуць напуста. Рыхтуйцеся быць ды-джэямі Ад-

vytoki.net






*Мясцовы Час — гэта відовішча!!*

раджэньня. Вам спатрэбяцца сувязі з фундатарамі, з адміністрацыяй будынкаў і ўстановаў, з дырэктарамі, настаўнікамі і, безумоўна, журналістамі. Пра вашыя шоў павінна пісаць мясцовая й сталічная прэса. Пра іх павінны размаўляць у школах і маладзёвых тусоўках: гэта найлепшая рэклама.

## 3. УНУТРЫ СУПОЛКІ

— Абавязкова зьбірайцеся на сьвяты, каб разам адзначыць Купальле, Каляды, Дзяды, Бітву пад Воршай ці ўгодкі Караткевіча. Такія ўтульныя сяброўскія вечарыны — незабыўны ўспамін.

— Зважайце на **прыроду** свайго краю. Мы ўсё ж эўрапейцы. Пільнуйце экалягічную сытуацыю, кантактуйце зь "зялёнымі", калі яны ў вас ёсьць, а йнакш будзьце самі "зялёнымі" (гл. Экалягічная камісія ў "Ключах"). Калі-нікалі варта сабрацца талакою ды прыбраць сьмецьце вакол школы ці вычысьціць парк. "Маладое Адраджэньне"

ў якасьці дворніка: вось вам выдатная сэнсацыя для мясцовай прэсы!

— Шыйце сьцягі, як мага болей — яны спатрэбяцца. Зрабіце вялікую харугву сваёй суполкі. Самі выраблйце шэўроны, значкі ці плеценыя "фенькі" з выявао сымболікі. Гэтым буйная суполка мусіць забясьпечваць сябе сама, можа нават сёе-тое падзарабіць.

— Вельмі карысна ладзіць для сваіх сяброў краязнаўчыя паходы, раскопы, экалягічныя й геалягічныя экспэдыцыі: беларуская зямля поўная таямніцаў і скарбаў.

## 4. УЛАСНАЯ ТВОРЧАСЬЦЬ

Калі ў вашым краі ёсьць маладыя музыкі, рок-гурты, паэты, пісьменьнікі, мастакі, тым больш, калі яны ўваходзяць у вашую суполку — ваш абавязак усяляк падтрымліваць гэтых людзей. Яны — заўтрашні дзень нацыянальнай культуры. Сярод іх — будучыя куміры краіны. Пазнаёмцеся бліжэй, пацікаўцеся глыбей іхняй творчасьцю. Дасылайце нам вершы, фотаздымкі, карыкатуры, запісы. Мы паспрабуем даць разьвіцьцё гэтым пачынаньням у сталіцы. Арганізоўвайце іх выступы, вэрнісажы, дапажыце з матар'яламі ці апаратурай — і вашая суполка стане для іх роднай сям'ёй.

Удзячнасьць творцаў, будзьце ўпэўненыя, шмат чаго вартая.

vytoki.net



# DISCO БЕЛАРУСКАЕ

Арганізацыя дыскатэкі, калі ўзяцца з розумам, справа элемэнтарная.

Першае — **ахова**. Падбярыце чалавек 5-6 дужых хлопцаў, якія здольны захаваць парадак і пры выпадку супакоіць вулічную шпану. Цяпер — **апаратура**. Праз Фронт, сваіх сяброў, праз клюбы, школы ці ПТВ калёнкі, узмацняльнік дый іншую тэхніку здабыць няцяжка. **Памяшканьне**. Пустуюць школьныя сталоўкі, актавыя залі навучальных установаў — вы можаце дамовіцца з дырэктарам ці арганізатарам, часам за пэўную плату. Нават зь недарагімі квіткамі, назьбіраўшы 50-70 чалавек, вы поўнасьцю акупіце выдаткі. Можна выходзіць і на бізнэсоўцаў — зь імі значна прасьцей размаўляць, але ж і грошай заплоціце болей. Круціце на дыскатэцы беларускія ("NRM", "Краму", "Уліс", "Палац" і інш.) ды, вядома, заходнія касэты ці кружэлкі. Маскоўскую папсу зь любой палітыкай раім наагул выключыць. **Ды-джэй**, натуралёва, павінны размаўляць па-беларуску. Пры гэтым варта зрабіць выгляд далёкіх ад палітыкі людзей: маўляў, проста сабраліся патанчыць. Мае сэнс зрабіць дыскатэку сталай, прыкладам, штомесячнай, ці раз на пару тыдняў.

Калі ваш уласны праект немагчымы — любымі сродкамі прабівайцеся на ўжо існуючыя дыскатэкі (школьныя, інтэрнацкія, сьвяточныя) — стасуйцеся з арганізатарамі, стаўце нашыя запісы, віншуйце патрыётаў па-беларуску.

Варта спыніцца на некалькіх важных момантах:

## 1.РЭКЛЯМА

Шмат хто думае, што варта толькі кінуць кліч, і моладзь табуном памчыцца на Вашую дыскатэку. Так не бывае. Прамоцыя — гэта даволі грунтоўная праца. Зразумела, калі Вы разьлічваеце не на вялае дрыганьне ў тусоўцы, а на яркае шумлівае Шоў.

Найперш, зрабіце з Вашага дыска **падзею**. Прымяркуйце яго да даты, ідэі, алімпіяды, футбольнага чэмпіянату альбо тэлевізійнага скандалу: да чагосьці вядомага й папулярнага. Распаўсюдзьце інфармацыю пра яго ў нефармальных асяродках і навучальных установах. Пусьціце **інтрыгоўныя чуткі**.

Disco неабходная правільная рэклама. Не пішыце ў абвестках "Беларуская дыскатэка" альбо, як зрабілі калісьці ў Барысаве, "Дiскотека на белорусском языке". Хай гэта будзе "Шоў-Дыска", "Disco Эўропа", "СупэрDisco" зь беларускім ды-джэем Каспэрам, Андрусём ці, напрыклад, Рэем. Група "нашых" усё адно прыйдзе, і забясьпе-

чыць актыўны кантынгент, які мусіць крычаць гучней і падтрымліваць менавіта беларушчыну.

Улёткі А4, зусім добра А3, з найбуйнейшым шрыфтам, каб здалёк кідалася ў вочы й чыталася на хадзе. Не перагружайце дыска-ўлётку падрабязнасьцямі. 5-7 радкоў хопіць (гл. узор).

**Расклейка** мусіць ахапіць стратэгічныя пазыцыі: навучальныя ўстановы, прыпынкі, крамы, скрыжаваньні, месцы нефармальных тусовак, вакзалы й інтэрнаты. На мястэчка для дыскатэкі ў 100 чалавек хопіць 15-20 папераў, у абласным цэнтры варта клеіць 30-40, а ў сталіцы і ўсе 50 улётак.

Ужо на самым disco раздавайце сваю **рэкляму**: маленькія ўлётачкі з кароткай інфармацыяй пра Вашую арганізацыю ("Маладое Адраджэньне", Раённую раду) — кшталту тых, што раздаюць мінакам у пераходах. Чым вы займаецеся, што вы можаце прапанаваць маладому чалавеку, запрашэньне на тусоўку й анонс наступнага мерапрыемства. Можна абілечваць наведнікаў а ўваходзе, але значна лепей — на выхадзе, калі разьвітваецеся. Гэта згладжвае адчуваньне спустошанасьці пасьля заканчэньня, і дае спадзяваньне на працяг.

**Увага! Не варта ўжываць у рэкляме палітычна рызыкоўных зваротаў і засьвечаных шыльдаў, такіх як МФ ці БНФ. Гэта стрэс і адчуваньне небясьпекі.** Усё адно ўсе ведаюць, што disco зрабілі "нацыяналісты".

## 2.МУЗЫКА

Пункт першы. Вашае **дыска** — гэта не штатныя танцулькі ў школе штосуботы. Гэта — **эўрапейская Дыскатэка**, і таму музычная праграма для вас канцэптуальная. Эўрапейскага паболей, амэрыканскага — у меру, беларускае — толькі найлепшае. **Расеі няма**. Удалы баланс — прыкладна 40% эўрапейскіх хітоў, 25-30% беларускіх, і астатняе на Ваш густ.

**Замежнае**. Будзьце мадэрновымі й стылёвымі. Стаўце новыя папулярныя хіты, якія на слыху, але не забывайцеся, што старыя добрыя легенды (Queen, Bon Jovi, Pet Shop Boys, Scorpions, Status Quo) — гэта гарантаваны посьпех. Абавязкова пастаўце 2-3 "зоркі сэзону", ад якіх ломяцца тэлеэкраны. Дзеля гэтага падыходзяць усялякія зборкі DJ'98, DJ'99, "The Best from the West" і да г.п.

Дайце адчуць народу, што Вы таксама "ў курсе".

**Беларускае.** Трэціна павольных і кожная чацьвёртая хуткая — беларуская. Гэтага павінна хапіць.

Рэкамэндуем, сьпіс хітоў (гл. табліцу).

vytoki.net



| Гурт ці зборнік | Хіты | Музыка |
|---|---|---|
| **"Made in Belarus"** | "Ты ж мяне падманула", "Грымата", "Чапурушка", "Каліна-маліна", "Ой, ляцелі гусі з броду" | хуткая, гучная, папулярная |
| **"Дыска беларускае"** | "Сані", "Мой край", "Чорны прынц", "Одзірыдзідзіна", "Калі скончылась ноч" | хуткая, лёгкая, папулярная |
| **"Песьнярок"** | "Я пастаўлю коніка", "Вологда", "Што за месяц" | рок |
| **"Палац"** | "Каваль", "Дарожка", "Merry Christmas", "Долам-долам" | папулярны фольк |
| **"Narodny Albom"** | "Маладое піва", "Аргентынская танга", "ЛаЛаЛаЛа", "Матка Боска Вастрабрамска", "Простыя рэчы" | поп<br>павольная<br>павольная |
| **Алеся** | "Мафія", "Калі скончылась ноч" | поп |
| **"Новае неба"** | "Шостае падарожжа", "Той, хто стаіць у мяне за плячыма" | павольная |
| **"Мроя", NRM** | "Партызаны", "Марш гопніка", "Я рок-музыкант", "Халі-галі", "Як на сямі ветрах", "Бывай" | рок<br>павольная |
| **"Мясцовы час"** | "Я жыў", "Хлопчык", "Вецер" | рок |
| **"Крама"** | "Слуцкая брама", "Хворы на рок'н'рол", "Бяжы, бяжы хлопец", "Ім не проба мой блюз" | рок |
| **Данчык** | "Мы адной табе належым", "Белавеская пушча", "Крыніцы", "Хатка па-над рэчкаю" | павольная |
| **"Уліс"** | "Радыё Свабода", "Вада з вытокаў", "Ратуйце нашы душы" | рок |

...а таксама Шалкевіч, Мельнікаў, "Зьніч", "Gods Tower", "Грунвальд", "Троіца", Hasta La Fillsta, Камэлот, "Жыгімонт Ваза", "Deviation", "Кальян", "Вэтэран Скрэпер" і г.д.

**Року паболей.** Рэч у тым, што нефармалы, рок і альтэрнатыва — гэта нашая стаўка. У дыскатэчнай аўдыторыі ад 1/2 да 2/3 складае папсовая публіка, а рокеры — толькі 20-25%, але менавіта гэты кантынгент, гэтыя актыўныя **нефармалы — нашыя людзі**. Рокеры, рэйвэры — масава незалежнікі. Да таго ж, і асноўная маса папулярнікаў ня супраць добрага року.

Але не перагружайце дыска адным ці двума кірункамі. Просяць папсу — давайце папсу. Просяць моднае — калі ласка. Ну, а калі пачынаюць прасіць ужо **беларускае** — значыцца, у вас усё лепш, чым мы думалі, і наступны разьдзел можаце не пісаць..

## 3.ДЫ-ДЖЭЮ

Весьці дыскатэку, у прынцыпе, можа кожны, толькі перастаўляй касэты. Весьці добрую дыскатэку можа й добры вядучы. Весьці файнае disco здольны толькі Ды-джэй у душы. Некалькі простых правілаў дапамогуць Вам адчуць сябе Ды-джэем Адраджэньня.

Гучны голас, упэўнены тон, эфэктная гаворка. Ня трэба казаць шмат — выкрыкніце 3-4 фразы, зь іх адну каронную, ды ўрубайце музыку. Але гэтыя некалькі сказаў павінныя заводзіць. "Такім чынам, сёньня мы ў Маладэчне! Цудоўны горад, цудоўная публіка! Сёньня ў нас для вас — супэрхіты сэзону! Эўропа, Амэрыка, і, канешне Бела-русь!! Музыка, ад якой дрыжыць увесь кантынэнт! Ангельскі "Oasis" — напачатку. Паехалі!"

Зьвяртайцеся да аўдыторыі, каб атрымаць дружны адказ: "Ну што, аматары року, спадабалася?!! *ТА-АК!!!*", "Хочам яшчэ? *Е-Э-Э!*", "А-атрымайце! Новы хіт на старт!", "Мы любім Маладэчна? *ТА-АК!*", "А мы любім свае нудныя заняткі? *НЕ-Э!!!*"

Будзьце папрасьцей — і людзі пацягнуца: "Мы — нефармальныя хлопцы? *Е-Э-ЭС!*", "А хто фармальны, той ненармальны!.."

Запомніце: людзі прыходзяць сюды разраджацца, трэсьціся — і, вядома, завязваць рамантычныя знаёмствы. Павольныя кампазыцыі — гэта сьвятое. Сьцішвайце голас да душэўнага пяшчотнага шэпту, калі абвяшчаеце "Wonderful Life", да прыдыханьня перад "Аксамітным летнім вечарам". У сваю чаргу, калі ідзе "Offsprings" ці "NRM", генэруйце змрочны бас з глыбіняў горла: "Што за лёгкае жыцьцё на нашай дыскатэцы... Насамрэч усё куды цяжэй... Цяжка, як цяжка,

vytoki.net





*Я вас ня чую!!!*

як не хапае ЦЯЖКАГА РОКУ!!!" — і зь нябёсаў абрынаюцца мэталічныя грымоты. "Я вас ня чую — дзе вашая падтрымка... горлам! галасавымі зьвязкамі! Вас не чуваць!!! *ГА-А-А!!!* О-о, я ўжо сябе самога ня чую!". "Гэй аматары папулярнае музыкі й старога добрага сэксу! Вішчым разам: Sex Apple! Ну-ка, тры-чатыры..."

## 4.РАСПАРАДНІКУ

**Першае.** Disco — мерапрыемства дастаткова рызыкоўнае. Пастарайцеся выключыць любыя канфлікты, высьвятленьні дачыненьняў у залі, радыкальныя скандаваньні, моцныя напоі й пустыя бутэлькі. Майце на ўвазе, на любой Вашай дыскатэцы можа быць "кантралёр", і калі весьці сябе неасьцярожна — Вашае дыска адміністрацыя папросту прыкрые.

**Другое.** Адрознасьці ў паводзінах вясковае, местачковае й гарадзкое моладзі. Публіка ў **сёлах і мястэчках** куды менш разборлівая ў якасьцях музыкі, ім толькі падавай, але весь дыскатэчны эты-

СТУДЭНЦКІ "МА-КЛЮБ" ПРАДСТАЎЛЯЕ:

# DISCO

# ЭЎРОПА

## 21 СЬНЕЖНЯ

ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ МЭТАЛІСТАЎ
ЗЬ 17:00 ДА САМАЕ ПОЎНАЧЫ

СУПЭР! — ROCK, POP, RAVE, FOLK, TECHNO

DJ P...

АМЭРЫКА!
ЭЎРОПА!!
...АРУСЬ!!!

vytoki.net



11 лютага

МФ клюб
Фэстывальны цэнтар
"АКВАРЫЮМ"
КУЛЬМАН, 14 (ЗА КАМАРОЎКАЙ)

19:00

ПРЭЗЭНТУЮЦЬ
КАНЦЭРТ-АКЦЫЮ

# ВОЛЬНЫЯ ТАНЦЫ

ULIS
N.R.M.
ZNICH
КЛЕП
КАМЭЛЕ
EXIST

КВІТКІ ПРАДАЮЦЦА НА СТ.МЭТРО "ПЛ. ЯКУБА КОЛАСА" ЦІ ПЕРАД КАНЦЭРТАМ
КУЛЬМАН, 14 (ЗА КАМАРОЎКАЙ)

60,000 БЯЗ

кет можа падацца некальткі грубаватым. Яно й ясна: тут Вам не сталіца. А вось у **горадзе** давядзецца куды больш упірацца на якасьці хітоў і вядзеньне — там кантынгент даволі патрабавальны. Вашы заўсёдныя козыры — лепшыя эўрапейскія, амэрыканскія й беларускія кампазыцыі, гучны ды-джэйскі голас і бадзёрае вядзеньне.

**Трэцяе.** Падыходзяць і **просяць** штосьці паставіць. Пажадана, па магчымасьці, задавальняць усе прозьбы, асабліва — віншаваньні й прывітаньні, якія можна весела, адной левай, абыгрываць з альбомамі, песьнямі й хітамі. Наконт расейскае папсы тлумачце ветліва, але цьвёрда. Важна надаваць больш увагі **лідэрам**, важакам тусовак. З гэтымі ніколі не канфліктуйце. Больш таго — заводзьце знаёмствы, давайце пяць, братайцеся, нават калі Ваш лідэр нападлітку. І помніце: Вашае апірышча — нефармалы.

vytoki.net



# ШОЎ БЕЛАРУШЧЫНЫ

Знакамітае **Шоў Беларушчыны**, арыгінальная ідэя "Маладога Адраджэньня", яго гонар і легенда, уяўляе сабой выступ перад навучэнцамі школаў і ВНУ зь інтэлектуальнымі віктарынамі й рок-музыкай. За ўвесь час працы мы правялі больш за дзьвесьце такіх выступаў. У адным толькі Менску больш за 10 такіх гуртоў.

**Шоў-гурт "Маладога Адраджэньня"** — гэта каманда, што праводзіць выступы, конкурсы, віктарыны ў школках, ВНУ, тэхнікумах, наладжвае беларускія шоў з музыкай і прызамі. Існаваць яна можа пад маркаю чыста асьветніцкага студэнцкага альбо школьнага клюбу. Вылучыце вядучага, падбярыце **знаўцаў**, здольных цікава распавесьці пра гісторыю, рэлігію, спорт, музыку (асабліва сучасную), дойлідзтва Беларусі. Дамаўляйцеся пра выступы перад клясаю ў 20-30 чалавек (бо перад поўнаю актавай заляй безь мікрафону вельмі цяжка) — прыкладна так, як тое робяць у тэлестудыях. Папрасіце магнітафон, дыяпраектар — яны ёсьць у кожнай навучальнай установе.

Выступ шоў-гурта ў школцы праводзіцца паводле наступнай схемы:

1) **Прадмова**: прадстаўце сваю каманду, умовы конкурса, абавязкова пакажыце прызы — пару беларускіх касэтаў, некалькі кніжак.

2) **Віктарына** (гл. 2-гі томік "Збораў Беларушчыны" — "Інтэлектуальныя гульні", дзе сабрана больш за 50 гульнёвых тэкстаў). У перапынках між блёкамі пытаньняў стаўце на магнітафоне беларускія рокавыя хіты — хай адгадваюць выканаўцу й назву альбома. Замест нашых тэстаў можна выкарыстаць складзеныя вамі пытаньні зь мінуўшчыны й сучаснасьці вашае мясцовасьці і наагул Беларусі.

3) Калі застаўся час, пакуль вы рахуеце вынікі конкурсу — выступае **знаўца** нечага, і цікава, але сьцісла асьвятляе сваю галіну.

Непажадана зацягваць справу больш за гадзіну-паўтары, каб не стамляць залішне гледачоў. У якасьці дадатковае агітацыі варта раздаваць беларускія газэты й часопісы (прыкладам, "Нашу Ніву"), каляндарыкі, дэманстраваць калекцыі беларускіх карысных выкапняў, ілюстраваныя кнігі.

Дзеля таго, каб удала правесьці "Шоў беларушчыны" — брэйнрынг ці віктарыну — варта мець на ўвазе некалькі правілаў.

**1**. Са школьнікамі **4-5 клясаў** можаце быць спакойныя. Ласкавыя й добрыя. Ваш аўтарытэт настаўніка для іх бясспрэчны. Не



*Брэйн-рынг у школе. Менск, Заводзкая Рада.*

прыкрыквайце, калі шумна: яны супакояцца самі. У гэтым узросьце іх характарызуюць дадатныя эмоцыі й асабістае спаборніцтва. Вельмі важныя, канечне, прызы. Рэкамендуем "Шоў беларушчыны". Тым жа часам Вы павінны мець на ўвазе: у малодшых клясах шанцы арганізаваць суполку, нават культурніцкую, мінімальныя.

**7-9 клясы** — складаная катэгорыя. Дзеці яшчэ не настолькі выраслі, каб сур'езна замахвацца на Ваш аўтарытэт старэйшага, але ўжо досыць разняволеныя, каб сапсаваць Вам гульню й падвергнуць сумневу Вашыя веды. Калі школа лічыцца спакойнай, асаблівых прычынаў для хваляваньня няма. Але як гэта хуліганская ўскраіна — будзьце гатовыя й павысіць голас, і чакальна замаўчаць, калі трэба, і цьвёрда зірнуць у вочы. Сама вернае — упэўнены, гучны голас. Калі Вы бесперабойна, гучна размаўляеце й вам ёсць што сказаць — у вас практычна ня будзе праблемаў. Любыя дзеці будуць захопленыя. Тым ня менш, звычайнае гарэзаваньне ня трэба прымаць за суцэльны гвалт і правал. У гэтым ўзросьце значна больш клопатаў з хлопчыкамі. Дзяўчаты куды больш разважлівыя, і сярод пераможцаў, як правіла, яны трапляюцца часьцей.

vytoki.net





*Выступ шоў-гурта "Маладога Адраджэньня". Шоў Беларушчыны. Менск.*

А вось у **10-11-х клясах** хлопцы спакайнеюць і, як вынік, перамагаюць. Найбольшая ж небясьпека падсьцерагае Вас, як можна здагадацца, менавіта зь дзявочага боку. Дзяўчаты ужо па-даросламу ёдкія, языкатыя і ня супраць узяць усю ўвагу на сябе. Рыхтуйцеся выглядаць элегантна ды бездакорна: неахайнасць вядучага можа быць жорстка абхіхіканая. Урэшце, у вас ёсьць шанец мімаходзь прымусіць здрыгануцца два-тры сэрцы. Што ж тычыць парадку, дык найлепшы парадак — гэта захопленая гульня, упэўненасць і месцамі рытм мазгавога штурму. Вельмі важна своечасова й імправізавана згумарыць. У адваротным выпадку шоў будзе вялым і малацікавым. Не запомніцца.

**2. Пачатак**. Як толькі вы ўвайшлі ў клясу, кіньце 2–3 азнаямленчыя дружалюбныя рэплікі, кшталту: "Штосьці дзяўчаты, хлопцаў у вас небагата..." альбо "Ну што, шаноўныя, у нас сёньня з раніцы быў на дзіва беларускі дзень..." Пажартуйце — гэта разнявольвае залю і вас. Пастарайцеся вывучыць ад зубоў першыя 3-4 уступныя сказы: пачатак мусіць быць энэргічным і няэмушаным.

Рыхтуйцеся да таго, што вам давядзецца сутыкнуцца з адной непрыемнай працэдурай пад кодавай назвай "Хлопчык для

біцьця". Налачатку вашае віктарыны вы маеце ўсе шанцы пачуць: "А почему по-белорусски? А давайте по-русски! А вы что, по-русски не умеете?.."

Вы імгненна арыентуецеся, вычапляеце **таго, хто гэта сказаў**: "Стоп. Як цябе завуць?" — Вова. — "Дык вось, Вовачка, ты што, з Тамбова прыехаў? Ты з Расеі? Не?! Дык ты **беларус**? Няўжо, у цябе **сваёй** мовы няма?"

Выключна важна "біць" толькі таго, хто заікнуўся. Калі вы пачнеце: "О-о! Ну што гэта за кляса.. Ну вы даеце, гэта ж ваша родная мова"— вы на баль зьніжаеце агульны гульнёвы настрой, і адразу адзнаку за выступ сабе. Гэтага нельга дапускаць. Біце ў кропку, і кляса падтрымае вас – або маўчаньнем, або дружнымі насьмешкамі над ня ў меру языкатым Вовачкам.

**3.** Ключавы момант: **пляcканьне ў ладкі**. Усе амэрыканскія шоў, знакамітыя вядоўшчы й тэлевіктарыны трымаюцца на галоўным прынцыпе: Воплескі! Уаў! Лавіна авацыяў. Псыхалягічны эфект сьвята, настрой карнавалу, фаервэрку, салюту дае менавітае шумлівае пляcканьне ў ладкі. Гэта атмасфэра гульні, гэта газарт і ўзнагарода для ўсіх, якая нічога не каштуе, але купляе ўсіх. Таму пасьля кожнага правільнага адказу пляскайце ў ладкі! Гучней!!! І, калі 90% клясы ўжо ня ўдзельнічаюць у дзяльбе балаў, ужо згубілі шанец на прызы — хай "хварэюць", хто за Андрэя, хто за Таню! Хай пляскаюць і вішчаць! Зрывайце воплескі самі, прасіце настаўніцу, падвышайце тон голасу да пераможнага крыку: — "Оў! Правільны адказ!! Фантастыка!.." І гэта сапраўды будзе фантастыка.

Іншы раз посьпех прыносіць і няхітры прыём: падзел клясы на **каманды**. Прыкладам, на левым шэрагу ў нас сядзяць **каліноўцы**, на сярэднім — **скарынаўцы**, на правым — **пазьнякоўцы**. Калектыўная гульня больш эфэктная, прынамсі, дружная падтрымка воплескамі вам забясьпечаная.

**4. Асноўнае — гаварыць.** Гаварыце па-беларуску наколькі можна упэўнена, гучна, бесьперастанку. Агаломшвайце дзяцей, падлеткаў, моладзь, каб яны нямелі перад вашай манэрай — ці пакручастай, ці ляканічнай і колкай. Няважна, што Вы памыліліся, абмовіліся — нязмушана балбачыце сабе далей. Калі усе засьмяяліся — сьмейцеся разам зь імі. Не дазваляйце сабе злавацца на сьмех, інакш Вы прапалі. І часьцей, часьцей зьвяртайцеся ў залю, вядзіце мамэнтальныя дыялёгі зь любое дробязнае нагоды. "Я бачу, вунь тая дзяўчына так моцна задумалася над пытаньнем, што зараз ад ... ито-небудзь?". "Э-э, сябра мой,

vytoki.net



## Пашпарт шоў-гурта Маладое Адраджэньне



Шоў-гурт: [illegible]
Заснаваны: 10.05.98
Лідэр: [illegible]

| № | Дата выступу | Нумар школы (назва ВНУ) | Кляса (Курс, Група) | Катэгорыя выступу (тэст, брэйн-рынг, віктарына) | Пераможцы (указваюцца імёны, прозьвішчы першых 4-5, пажадана ўзяць тэлефоны і падарожныя найбольш перспектыўных) | Колькасьць балаў | Пасярэднік (настаўнік, выхавацель, арганізатар), кантакты |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 23.03.98 | шк. №109 | 11"А" | віктарына | 1. [illegible] 2. [illegible] 3. [illegible] | 10 9 8 | [illegible] |
| 2 | 23.03.98 | шк. №109 | 10"Б" | віктарына-шоў | 1. [illegible] 2. [illegible] 3. [illegible] | 27 18 16 | — — — |
| 3 | 23.03.98 | шк. №109 | 9"А" | віктарына [illegible] | 1. [illegible] 2. [illegible] 3. [illegible] | 13 12 15 | — — — |
| 4 | 9.05.98 | шк. №109 | 9"Б" | віктарына | 1. [illegible] 2. [illegible] 3. [illegible] | 13 6 5 | — — — |
| 5 | 9.05.98 | шк. №109 | 9"В" | віктарына | 1. [illegible] 2. [illegible] 3. [illegible] | 12 10 8 | — — — |
| 6 | 9.05.98 | шк. №109 | 8"Б" | віктарына-шоў | 1. [illegible] 2. [illegible] 3. [illegible] | 8 7 5 | — — — |

*Пашпарт шоў-гурта. Менск, Заводзкая Рада.*

ды ў вас ужо сем балаў, дайце іншым падзарабіць на хлеб", "Стоп-стоп, якія дзесяць тысячаў ... Гэта ў вашым буфэце булачка за 10 тысячаў..."

Урэшце, **інтанацыя**. Зьмяняйце тэмбар голасу ад шэпту да выкрыку; выкарыстоўвайце і цяжкі выдах, і зьдзіўлены подсьвіст (зразумела, як мага больш вольна й натуралёва), і "так-так-та-ак", і "ого-го", і да г.п. Многае, канечне, залежыць ад аўдыторыі. Калі яна жыва, прыязна на Вас рэагуе, сьмела экспэрымэнтуйце. Калі Вам падасца, што дзеткі чапурыстыя й нудныя, паспрабуйце разварушыць іх папулярнымі тэмамі, жартамі й зацікаўленасьцю. Падтрымлівайце спаборніцтва й самі закручвайце, нагнятайце інтрыгу, накал барацьбы. У такім выпадку Вам гарантаваная кульмінацыя — дружнае "Жыве!" у адказ на ваш воклiч "Жыве Беларусь!". Дзеткі, калі Вы не забыліся, любяць раўнуць што-небудзь такое без настаўніцы на поўную глотку. Дайце ім гэтую магчымасць.

**5. Выгляд.** Лепш афіцыйны ("канфэрансье"), чым занадта сьціплы й прасьцяцкі, асабліва для старэйшых. Старайцеся быць стылёвым. Калі сьпінжак — аніякіх джынсаў. Гальштук, ясная справа, па-за красоўкамі. Ну, вы зразумелі. І калі ўжо неахайнасьць, тады ўжо знарочыстая й самаўпэўненая — ад брудных ботаў да ўскудлачанае прычоскі... Жартую.

**6. Рух**. Рухацца. Лепш стаяць, чым сядзець. Лепш прагульвацца, чым проста стаяць. Лепш хадзіць і нешта паказваць, чым проста прагульвацца. Так вы сьвядома прыцягваеце ўвагу. Школьны й студэнцкі зрок уладкаваны так, што рух=цікавасьць. Пажадана жэстыкуляваць не абы-як (а то будуць перакрыўліваць); пісаць на дошцы вялікімі літарамі (але не замнога); выкарыстоўваць у прыкладах рэчы на партах (але, вядома, без рызыкоўных апэрацыяў). Рух твару, міміка, выразнае абазначэньне ўсьмешкі, шчырага сьмеху, заклапочанасьці, чаканьня, заінтрыгаванасьці іншага разу значаць ня менш, чым зьмест пытаньняў.

**7. Музыка ў перапынках**. Гэта, дарэчы, палова посьпеху. Калі Ваш магнітафон у перапынках не падвядзе, будзьце пэўныя — для падлеткаў гэтая мэлёдыя будзе незабыўным успамінам. Успомніце, што для Вас азначала калісьці раптоўная музыка пасярод урокаў — і вы зразумееце.

Ставіць найлепш рытмовыя, мэлядычныя й глыбокія кампазіцыі. "Я жыў!", "Хлопчык", "Вецер" (Мясцовы Час), "Радыё Свабода" (Уліс), "Бывай" (NRM) "Як на сямі вятрах" (Мроя), "Калі скончылась ... in Belarus, "Шостае падарож-

vytoki.net





*Шчасьлівыя школьнікі разам з шоў-гуртом "Маладога Адраджэньня" пасьля віктарыны.*

жа" (Новае Неба), "Матка боска вострабрамска" (NA). "Марш гопніка" з Мроі ці "Маладое піва", "Аргентынскае танго" з Народнага Альбому, "Одзірыдзідзіна" NRM цудоўныя як разрадка. Вельмі файна ідуць "Камэлот", "Палац" і "Крыві".

**8. Пасьля**. Атрымальнікі вашых прызоў, пераможцы — павінныя тут жа быць адзначаныя ў картачцы (пашпарт "Маладога Адраджэньня", гл. узор) і тут жа запрошаныя ў вашую тусоўку, клюб, на бліжэйшае мерапрыемствы (як правіла прыходзяць) і тут жа адораны візытоўкай ці пісьмовай (!) адрэсай і тэлефонам.

І, **галоўнае**. Тое, што трэба помніць заўсёды: калі ваш выступ удалы, ён застаецца ў памяці хлопцаў і дзяўчатаў, як адзін зь лепшых школьных успамінаў на ўсё жыцьцё. Гэта неацэнны вынік, якім варта даражыць. Адчуйце вашую **адказнасьць** за Шоў і за гэтых маладых людзей, для якіх вы можаце зрабіць сапраўднае **сьвята**. Што б ня здарылася — як сьпявае Freddy Mercury — SHOW MUST GO ON!

# ЯК НАЛАДЗІЦЬ РОК-КАНЦЭРТ

Да ўзмацняльнае апаратуры вам спатрэбіцца **сцэна**. Пажадана пляцоўка, крытая ад дажджу, дзе колечы ў парку, але падыдзе й **актавая заля** на колькі соценъ месцаў. Дамаўляйцеся з адміністрацыяй парка ці будынка, аднак памятайце: ніякай палітыкі! БНФ?! Які БНФ?! Проста зьбіраемся паслухаць музыку. Зразумела, трэба паклапаціцца пра ганарары музыкам. Прыкладна за 200–300 даляраў можна прывезьці ў любы беларускі горад "NRM", "Новае Неба", "Уліс" і "Мясцовы Час" разам, а гэта ўжо капітальнейшае рок-відовішча. "Крама" й асабліва "Палац" абыдуцца даражэй. Трэба грошы — без фундатараў, бадай, не атрымаецца. Выходзьце на бізнэсоўцаў. Вашыя прапановы да іх: вы ўвесь канцэрт рэклямуеце свайго дабрадзея, можаце паставіць на сцэне плякат зь ягоным фірмовым знакам, альбо распаўсюдзіць (расклеіць) абвесткі ягонай фірмы. Плюс — згадаць пасьля ў газэце: "Канцэрт адбыўся дзякуючы..." Словам, вашая суполка можа зрабіць **рэкляму**, а гэтая паслуга дорага каштуе. На буйны канцэрт спатрэбіцца, мабыць, запрасіць некалькіх фундатараў.

Калі ў вас усё падрыхтавана — тэлефануйце гуртам (гл. Ключы.



vytoki.net



Маладыя Рок-Фронт) і дамаўляйцеся. У скрайнім выпадку зьвяртайцеся ў Менск, паведамляйце вашыя ўмовы, і мы зьбяром вам каманду гуртоў.

Паміж выступамі паведамце пра вашую бліжэйшую імпрэзу (дыскатэку, экскурсію). Ну і, вядома, **працуйце з заляю**, прыглядайце кандыдатаў у вашую суполку,.

Калі ў вас няма магчымасьці "падняць" суцэльны канцэрт, можна запрасіць і адзін гурт, і некалькі сьціплых маладых выканаўцаў альбо барда.

# ЯК ПРАВЕСЬЦІ ЭКСКУРСІЮ

Гэта, бадай, найпрасьцей. Дамаўляйцеся з дырэктарам музэю, ці распарадчыкам выставы, ці з энтузыястамі, якія займаюцца раскопамі. Неблагія йдэі таксама — наведаць навукова-дасьледчую ўстанову (вам абрадуюцца) ці вэрнісаж тутэйшага мастака. Абавязкова пашукайце шчырых беларусаў сярод адміністрацыі кінатэатраў, відэазаляў і г.д. — будзе магчымасьць паказаць беларускія стужкі "Данчык", "Куралаты", "Вяртаньне Міхася Забэйды", мясцовыя фільмы, а можа й нават кадры "Менскай вясны".

# ЯК ЗАДЗІНОЧЫЦЬ ГУРТОК

Лепш за ўсё выкарыстоўваць сыстэму ЖЭСаў. Рэч у тым, што ў распараджэньні кожнага ЖЭСу вылучаецца кватэра й сродкі для наладжваньня дзіцячых гурткоў. Вы можаце бясплатна прапанаваць ім свае паслугі — і, праводзячы двойчы на тыдзень заняткі мовай, музыкай, гісторыяй, атрымаеце ключы ад пустое кватэры, часьцяком нават з тэлефонам. Яшчэ раз нагадаем: ніякай палітыкі ў перамовах з адміністрацыяй! Вы — ціхія студэнты-энтузіясты, што любяць вожкацца зь дзецьмі. Сабраць наведнікаў у ваш гурток — усяго-ткі расклеіць аб'явы ў 2-х ці 3-х навакольных школах. Разьлічвайце на дзяцей 5-6 альбо 10-11 клясаў, бо зь іншымі будзе процьма праблемаў. Вядзіце справаздачнасьць сваіх заняткаў (потым прад'явіце). Вы можаце зьбіраць там сваю школьную суполку (двойчы на тыдзень), і выкладаць ёй беларушчыну.

vytoki.net



# ЖЫВЫЯ ШОЎ

## БАЛЯВАНЬНЕ Ў ДЗЯВОЧАЙ ВУЧЭЛЬНІ.

У вучэльні менскага камвольнага камбінату мы выступалі двойчы. Пікантнасьць сытуацыі палягала ў тым, што навучаюцца тут **адныя** дзяўчаты. Колькісот дзяўчатаў, самага што ні ёсьць прызыўнога ўзросту, і аніводнага хлопца. Можаце сабе ўявіць. Выкладаюць, ясная справа, жанчыны. Адзіны супэрмэн — сіваваты пажылы гарманіст, настаўнік сьпеваў — карыстаўся тут проста шалёнай папулярнасцю.

І вось актавая заля, бітма набіта каля дзьвухсот дзяўчат. У журы, зразумела, гарманіст з выкладчыцамі. На сцэну выходзяць чатыры нашыя хлопцы... Хор захапленьня! Ад віску дрыжалі аграмадныя, ува ўсю сьцяну, вокны. Само сабою, абыякавым нельга было застацца. Вядучы ўва ўдары. Асыстэнты — каліфы. Брэйн-рынг (а дзяўчаты ў камандах рэзаліся курс на курс, заля, адлаведна, ішла сьценка на сьценку), якога ня бачыла тэлевізія! Шквал эмоцыяў. Гарманіст камусьці яўна падыгрываў... Пратэсты з залі па-беларуску...

Урэшце, прызы, сьціплыя кніжкі й касэты, пераможныя прыгажуні прымалі з рук галянтнага вядучага як фотамадэлі; у залі ўспыхваў кодак і аўдыторыя дружна крычала "Ваў!"...

Зразумела, беларусачкам спадабалася. Праз пару тыдняў нас запрасілі ў пашыраным складзе на "Восеньскі баль". Салодкі стол, конкурсы й дыскатэка.

Каля пяцідзесяці нашых адборных хлопцаў былі загадзя падрыхтаваныя. З тартамі й кока-колай, на двух тралейбусах каманда рушыла ў кірунку вучэльні. А там сотня, скажам так, трохі драпежных дзяўчатаў ужо накрывала сталы й рыхтавала залю. Спачатку быў **вечар** , дзе нешта на памяць чыталі й сьпявалі, спаборнічалі ў распрананьні (між іншым, груповым) і паядалі пад колу дзявочую выпечку й тарты. Сьвецкі раўт зьмяніўся дыскатэкаю. Раптоўная расейшчына выклікала мітынгоўнае скандаваньне: "NRM! NRM!", пасьля чаго папса памерла й пачалося сапраўднае беларускае disco. Скажу, бо бачыў на ўласные вочы: некаторыя парачкі танчылі гэтак горача, што была проста зайздрасьць глядзець. Нямала нашых выходзіла з залі пад ручкі, ціха варкуючы па-беларуску й перабіралася ад шумлівае сумятні ў які-небудзь ёмісты куточак.

Амапаўцы з сабакам, якія зайшлі чыста пацікавіцца, з задавальненьнем патусаваліся. І нават патанчылі. Не з сабакам, канешне, зь дзяўчынай. Проста хлопцаў на ўсіх не хапала.

І магутна, інакш ня скажаш, выглядала фінальная сцэна. Калі ўсе скончылася, соцэнны шэраг дзяўчатаў выстраўся ў калідоры, і наша баявая харугва, што праходзіла скрозь гэты шыхт, штокрок атрымоўвала лёгкія пашлёпваньні й цёплыя поцыскі з пажаданьнямі хуткай сустрэчы.

## РОК ПАДЧАС УРАГАНУ

Гэты дзень 23-га чэрвеня 1997 г., ужо ўвайшоў у сучасную гісторыю Беларусі як дата страшнейшага ўрагану, які, калі помніце пранесься над Пружанамі, Стоўбцамі, Нясьвіжам, і абрынуўся на сталіцу. А між тым, менавіта ў той самы час у менскім Парку Горкага, на беразе Сьвіслачы, "Маладое Адраджэньне" разам зь "Беларускай Маладзежнай" ладзіла рок-канцэрт.

Пад вечар, калі пачалі выступаць навенькія гурты, пляцоўка перад адкрытаю сцэнаю была ўжо поўная. Народ лежма ляжаў нават на схілах насыпу праспэкту й поседам сядзеў на сьвіслацкім парапэце. Вітаўт Супрановіч, распараднік дзейства, штохвіліну прабягаў ад брамы парку за сцэну са скрынямі піва. Некалькі тысячаў маладых людзей зь сяброўкамі, бляшанкамі й бутэлькамі, дружным гулам віталі куміраў — "Новае неба", "Уліс", "NRM", то тут, то там узьметваліся бел-чырвона-белыя сьцягі й раўло: "Жыве Беларусь!" Міліцыя не рызыкавала падыйсьці да натоўпу бліжэй чым на сотню крокаў і трымалася наводдаль.

Калі з боку рэзыдэнцыі пачала насоўвацца аграмадная чорная хмара, сьвята было ў самым разгары. Народ захапіўся няўжарт. Чакалі "Краму". Аднак ледзь Ігар Варашкевіч выйшаў на сцэну, толькі музыкі кранулі струны — шарахнуў страшэнны гром, спорна-спорна пайшоў дождж, і раптам хлынуў лівень. Усе абарвалося. Моладзь уроссып шуганула пад елкі ды кустоўе, але шквалісты вецер незвычайнае сілы разгойдваў старыя таполі й ліпы, няйнакш намагаючыся вывярнуць іх з коранем. Нешта трашчала. Музыкі, скрозь мокрыя, сьпехам згортвалі апаратуру. Між тым упартыя фаны, чалавек восемдзесят, тырчалі перад сцэнай і патрабавалі ў такт грому: "Кра-ма! Крама!" Нехта з бардаў, ўкрыўшыся сьцягам, паспрабаваў быў канцэрт працягнуць, але не пратрымаўся й хвіліны. Замачыла. Трэба было бачыць гэткую фээрыю: ураган, шум дрэваў, моладзь упокат пад кустамі — і ашалелыя фанаты пад громам, з узьнятымі рукамі пасярод залітае плошчы, перад пустою сцэнай...

Тым ня менш, разыходзіліся задаволеныя. Асноўную частку зараду атрымаць усё-такі ўдалося. Апроч таго, і нечуваны ўраган цудоўна ўпісаўся ў карціну відовішча.

vytoki.net






**Памятны рок-канцэрт 23.06.97 г.**

Назаўтра пра разбурэньні распавядала тэлевізія й пісалі газэты. "Сіла беларускага року", — камэнтаравалі дасьведчаныя. Дадамо: гэта быў першы канцэрт, дзе выступалі выключна беларускія гурты.

## МАР'ІНА БОЙКА

Беларускае дыска праводзілася ў Мар'інай Горцы. Варункі вымагалі неардынаных мераў бясьпекі — усё-такі ў Мар'інагорскім вайсковым гарадку рыхтуюць адборныя кадры для сілавых ведамстваў, а самое места заселенае значнаю колькасьцю армейскіх сем'яў. Мы пабойваліся, што танцы паспрабуюць сарваць, і таму ўваход у залю вартавалі ўзмоцненыя патрулі Маладога Фронту.

І вось грымнула "Мроя", чалавек дзьвесьце моладзі падхапілі дыскатэчны рытм. Усё йшло як мае быць. Ды-джэй выкрыкваў



*Малады Фронт — гэта сіла!*

назвы эўрапейскіх ды беларускіх рокавых хітоў, хлопцы й дзеўкі адказвалі дружным захопленым крыкам, але ўжо на сярэдзіне танцаў ахова заўважыла падазронае гуртаваньне ля ўваходу. Высьветлілася, якаясьці дваровая тусоўка, падначаная, кажуць, мясцовымі камсамольцамі, выказвала незадавальненьне музыкаю. Стала ясна: пасьля Шоў у паветры ўзьнікне адвечнае пытаньне: "Хто вінаваты?"

І сапраўды: не пасьпелі скончыцца танцы, як паблізу ад будынку зачапілі аднаго з арганізатараў. Пайшла пацеха! Агульная звалка на цёмных вуліцах скончылася поўнаю перамогаю "бел-чырвона-белых". Расьсеяная шпана сабралася толькі назаўтра, але мэта была ўжо іншая — "біць морды камсамольцам!" Сярод камэнтароў да [illegible] шкадаваньне: "Падставілі!"

vytoki.net



## ТАНЦЫ ГУМАНІТАРАЎ

Выступаць у Беларускім гуманітарным ліцэі — адно задавальненьне. Выкладчыкі — Барычэўскі, Колас, Вячорка, Трусаў. Моладзь — усе свае людзі, напалову — беларускамоўцы, а дзе-ндзе й "агалцелыя" нацыяналісты. Таму сваё Першае Беларускае Дыска ўвосені'96 "Маладое Адраджэньне" арганізавала менавіта тут.

Колькідзясят ліцэістак запоўнілі рэхам залю яшчэ задоўга да прызначанага часу; яны бадзяліся па калідорах ды драпежна пaглядалі на спрытных хлапцоў-ды-джэяў, што ўвіхаліся каля апаратуры. Яшчэ да пачатку вядучыя дыска пасьпявалі й наладжваць апаратуру, і міла жартаваць зь дзяўчатамі, і супакойваць адміністрацыю, і нават запіваць усё вышэйпералічанае півам. За такімі зьмястоўнымі праводзінамі часу, яны натуральна, праміргалі афіцыйны пачатак цырымоніі й спахапіліся толькі тады, калі народ, што паціху запоўніў залю, дружным скандаваньнем запатрабаваў NRM'у.

"Атрымайце!" — нечалавечым голасам зароў ды-джэй Танана, сьвятло ўраз згасла, запульсавала сьветламузыка й калёнкі рушылі ў рокавым рытме. Пайшло гульбішча. Знакаміты прад'юсар айчыннага шоў-бізнэсу сп. Супрановіч ашалела танчыў зь бел-чырвона-белым сьцягам; нацыяналісты раўлі "дава-а-ай!" і ды-джэй Карповіч даваў мэгатоны гуку. На хрумст паркету прыбег шаноўны Л. Барычэўскі, і разагрэтая грамада прывітала яго такім звар'яцелым крыкам, што сп. Лявону заставалася ално шапнуць у мікрафон "дзякую!", і таямніча зьнікнуць.

Апоўначы жудасныя патрыятычныя крыкі агаласілі навакольле стадыёну "Дынама". Міліцыянты асьцярожна пазашываліся ў кустоўі. Гэта йшло дахаты Першае Беларускае Дыска.

## ШОЎ БЕЛАРУШЧЫНЫ ПА-ЯПОНСКУ

Астрашыцкі гарадок — няблізкі сьвет. Усё ж 15 км ад сталіцы. Дарма, што побач Раўбічы — усё дрымуча, як астрашыцкія лясы.

Тая выпускная кляса, якая дасталася нашай апэратыўнай групе ў адзінай тутэйшай школе, глядзела на сталічных гасьцей дрымуча й пужліва, бы зубры на рэдактара "Белавескае Пушчы". І насамрэч, навошта тыя, у сьпінжачкох, прыпёрліся ў гэткую глухамань, прывалаклі з сабою якогасьці кітайца...

За кітайца, ці, дакладней кажучы, за японца быў у нас вядомы ў багемных колах эмігрант чацьвертае хвалі Рома Кавальчук — амэрыкана-канадыец беларуска-польскага паходжаньня (усё гэта, заўважце, у 19 гадоў), які чамусьці ведаў японскую ды мог гнуткімі

пальцамі сплесьці пару героґліфаў. Калі шчыра сказаць, менавіта майстэрства сэнсэя Кавальчука, а ня нашая даволі стандартовая праграма прымусілі канчаткова прыціхнуць застрашаную грамаду, што сабралася на вечарыну "Маладога Адраджэньня": бедных дзяцей, бацькоў, якія не рызыкнулі пакінуць сваіх дарослых нашчадкаў сам-насам з праўдзівым японцам, а таксама зьнямелых настаўнікаў беларускае мовы ў вышыванках.

Варта сказаць, што мы дасталі зусім мала балаў ды ўвесь час спадылба паглядалі на Рому. Пасьля яго мудрагелістага выступу, дзе японскія, польскія, ангельскія слоўцы бы мімаходзь рассыпаліся пэрлямі пасьля беларускіх, усе помыслы перадавой астрашыцкай грамадзкасьці засяродзіліся на ім. "Замежжа нам дапаможа,"— чыталася ў вачох. Нават цудоўны відэаэкскурс Аляксея Фралова пра беларускае дойлідзтва ня ў стане быў адцягнуць інкае ўвагі. Аграмадны цень даўгога Ромы, адкінуты дыяпраектарам, ўзвышаўся панад усімі.

Лёша "зрабіў" Кавальчука на зваротным шляху. Калі той у перапоўненым аўтобусе спакусіўся на забаўляньне хвікаючых правінцыйных дзяўчатаў, Фролік (так пяшчотна завуць у нас усеагульнага ўлюбенца) апанаваў аўдыторыю закаранелага электарату й да патрэбнага прыпынку давёў рашуча ўсім, што лепшая лаянка — расейская, а простыя словы, простыя рэчы, канешне — беларускія.

Вітаўт Ханэцкі, старшыня Згуртаваньня Беларускае Шляхты, які й арганізаваў памятную сустрэчу, дагэтуль карыстаецца ў Гарадку амаль малітоўнаю пашанай. Калі ў сувязі зь менскімі падзеямі, яго прыехаў браць аўтобус сталічнага амону, хлопцы з бліжэйшае дыскатэкі пад гарачую руку паклалі ўсю плямістую каманду на асвальт. Ханэцкі здаўся сам.

## ЛЕТНІК. СТОЙ, РАЗ-ДВА!

Гэта было, бяз жартаў. Брыгада МА нарвалася на летні лягер дзяцей вайскоўцаў. Пагаворвалі, дзесьці тут адпачывае сын Шэймана (зрэшты, у сьпісах пераможцаў такога прозьвішча не было). Калі мы даведаліся, куды трапілі, першым жаданьнем было тэрмінова зьліваць вадзічку. Але прыбіральні пад бокам не аказалася, і раззлаваныя ды-джэі вырашылі: "Ну, добра, за гэта — атрымайце шоў на поўную катушку!"

Перад пачаткам мерапрыемства ў вялізнай актавай залі, куды сабралося да баталёну (300) дзетак, грымнула афіцэрская праверк [illegible] жках з пагонамі хвілінаў дзэ-

vytoki.net



сяць абнюхвалі подыюм ды апаратуру, а вось бел-чырвона-белага абрусу а Іа Цэнтральная Рада на стале не заўважылі ўва ўпор.

Што ж, тым лепш. Андрэй Пятроў, які быў у гэты дзень музыкай, пачаў з аглушальных "Партызанаў" на дзьве магутныя калёнкі. Пасьля такога гукавага штурму дзеткі былі да шэпту ціхамірныя й адказвалі практычна на ўсё. Праўда, прыкладна трэцяя частка падлеткаў дэзэртыравала адразу ж, падчас NRM. Тыя дзьве роты дысцыплінаваных, хто дацярпеў да канца, атрымалі беларускія кніжкі й касэты з тымі ж "Партызанамі". Едучы дахаты, мы прыпаміналі частушкі чорнага гумару: нагэтулькі ўражанымі выглядалі дзеткі на расстаньне.

## ВІЦЕБСК. ПОЎДЗЕНЬ. ПОЛУДЗЕНЬ.

Менавіта так. У буйнейшай віцебскай школе ў мнагалюдным раёне навабудоўляў "Поўдзень", роўна ў полудзень пачалася нябачаная дагэтуль дзея. Пры поўнай залі (прысутнічала да 150 чалавек) паміж камандамі пяці 10-х клясаў разгарнулася пабаявішча на брэйн-рынгу "Маладога Адраджэньня".

Ужо пасьля 4-х тураў высьветлілася, што няма ніякай канкурэнцыі 10-му "Г" і ягонаму лідэру Андрэю Прэйсу. 15 балаў за 15 хвілінаў — гэта была, што называецца, гульня ў адну калітку. Гледачы ў захапленьні. "Галёрка", чалавек дваццаць хлопцаў, у падтрымку сваёй каманды ўзяліся дружна, па-хакейнаму, топаць нагамі й падпяваць. Сьцены дрыжэлі. Завучы й арганізатары забягалі паглядзець, што ж там адбываецца, а заля расхадзілася ўся!

У гонар пераможцаў пасьля віктарыны грымнула дыскатэка. Арабелая адміністрацыя школы пастаралася як мага скараціць маладзёвае сьвята й падганяла адраджэнцаў хутчэй сканчваць. Шкада, але давялося зарана закругляцца. Тым ня менш патанчыць зь дзесяціклясьніцамі ды-джэі ўсё ж пасьпелі.

## СЕРАБРАНКА, ЗАЛПАМ ПЛІ!

Іншым разам даводзілася працаваць і ў тры-чатыры рукі. Адна з такіх акцыяў адбылася ўвосені'97 у Серабранцы. У школе, дзе нас ужо добра ведалі зь мінулых выступаў, нам прапанавалі 4 асобныя клясы — усю восьмую паралель. Нас было дзесяцёра. Падзяліліся на брыгады — па два з паловаю,— разьмеркавалі прызы й разышліся ў розныя кабінэты. З гадзіну цэлае крыло школы аглошвалі гучныя жарсьці. Тамтэйшыя васьміклясьнікі адказвалі борзда, спаборнічалі ў дасьведчанасьці па-беларуску, і мне ўпершыню давя-

лося пабачыць, як тутэйшыя хлопцы ледзь не пайшлі сьценка на сьценку з-за аднаго няправільна залічанага балу. Газарт быў вельмі сур'ёзны. Пад канец, як салюты, з усіх чатырох кабінэтаў прагрымела: "Жыве Беларусь!" У адказ ракатала: "Жыве!" — заключныя акорды школьнага "Шоў Беларушчыны".

А потым для ўсіх была дыскатэка. Спачатку ввасьміклясьнікі недаверліва ціснуліся па кутках, але з "Палацам" не ўтрымаліся, высыпалі на пляцоўку. Пад эўралейскія хіты й NRM танчылі ўжо ўсе. Нашых хлопцаў и дзяўчатаў расхапалі мясцовыя, і ў паўзмроку нельга было разабрацца, хто гэта так захоплена вішчыць па-беларуску — няўжо нейкая школьніца?

## НЕФАРМАЛЬНАЯ ЗЭЛЬВА

Падзеі ў Зэльве ад самага пачатку складваліся досыць інтрыгоўна. Нам прапанавалі пятыя клясы. Горкія дзеткі, мэтар зь кепкаю, а што ж ім прыдумаць гэткага міленькага, беларусенькага... Але ўжо на пятай хвіліне вядучы быў прысаромлены школьніцкай абазнанасьцю. Зэльвенскія былі першымі, хто сказаў хорам як сьлед "Смачна есьці!" (менскія паўсюль перакладаюць "прыемнага апэтыту"). Ведалі й Альгерда, і Ларысу Геніюш, і нават, страшна сказаць, Пазьняка.

"Нас называюць "Ліцэем на балоце",— пасьля патлумачыла настаўніца.— Выкладчыкі добрыя падабраліся. А дзеткі... Нармалёвыя беларускія дзеткі." Што праўда, то праўда.

Заўважу такую дэталь: у віктарыне першае месца заняла 11-гадовая Карына Густыр, дзяўчынка крышку азіяцкага выгляду. Аказалася — дачушка патомных тутэйшых татараў.

Але сапраўдная моладзь чакала нас увечары, на дыскатэцы. Чалавек дзьвесьце...

Старэйшаклясьнікаў набіліся ў фае — не прадыхнуць. Зь першымі ж гукамі "Беларускага дыска" ўсё пайшло так дружна й натуралёва, быццам у гэтым краі спрадвеку валадарыла наша музыка. Мне надоўга запомнілася, як галасоў у дзесяць-пятнаццаць падвіскваалі "Чапурушку" дзяўчаты, а потым падбягалі да пульту папрасіць: "Пастаўце яшчэ чагосьці зь Беларускага дыска!"

Адзіная расейская песьня была выкананая ў забойным кантэксьце. Яе замовілі ў гонар адначасова 1-га й 2-га красавіка ("Дзень дурня" + "Дзень аб'яднаньня Беларусі з Расеяй"). "Сапраўды, гэта вельмі сьмешнае сьвята,— пракамэнтараваў у мікрафон ды-джэй,— якр[illegible]біў расейскі панк.

vytoki.net





*Гэтыя арыгінальныя маладыя людзі і ёсьць нефармалы!*

Увага! Ладзіць беларускае дыска нам дапамагалі мясцовыя бэпээсэмаўцы. Яны цудоўна размаўлялі па-беларуску й з "Маладым Адраджэньнем" паразумеліся ўмомант: "Вы беларускія патрыёты? Ну, дык і мы патрыёты: бэ-пэ-эс-эм. Жыве Беларусь!"

На Гарадзеншчыне гэта скрозь. Называецца, прывітаньне Янчэўскаму.

Але найбольш нас абрадавалі нефармалы. Мала таго, што ў гэткай глыбінцы сустраліся шэўроны з Пагоняй и бел-чырвона-белыя стужкі. Да нас падыходзілі суцэльнымі гурбамі й прасіліся "запісацца". Наш чалавек Сяргей Карпееў літаральна разрываўся між ахвотнікаў.

Пасьля Зэльвы скажу з упэўненасьцю: у заходнебеларускіх мястэчках ці ня самая ўдзячная аўдыторыя. Да таго ж, зычлівая й дабрадушная: ані дваровых сутычак, ані разборак, уласьцівых тыповаму гарадзкому дыску, мы ў гэты вечар не назіралі.

**ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ**

# БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ

*Гэта трэба адчуць. Чым больш я ўслухваюся ў тры мэлядычныя склады Яе імя, чым глыбей рассмакоўваю гэтыя сем гукаў, спрабуючы напрыканцы ўлавіць няісны, апошні, самы пранізьлівы, а ён усё прападае з празрыстай літарай; чым даўжэй любуюся гэтым хвалюючым, белым-белым з гарачай чырванью сьцягам — тым больш* ***веру****. У мяне пачынае буйней біцца сэрца й кружыцца галава. Хочацца ціха заплюшчыць вочы й малітоўна, урачыста шаптаць пра сябе: Магутны Божа! Бязьмежная мудрасьць Твая, непамерная ласка Твая! ДЗЯКУЮ Табе за тое, што я нарадзіўся менавіта ў ГЭТАЙ КРАІНЕ!..*

*У гэтай краіне ахвяраў, войнаў і катастрофаў, сярод народу геніяў і сьвятых. Сярод найвялікшых могільнікаў чалавечай гісторыі. У Імпэрыі Культуры, важнейшым духоўным цэнтры між Расеяй і Эўропай. Бо я веру, што Беларусь — гэта нешта намнога больш значнае, чым прынята думаць.*

## 1.ІМПЭРЫІ ДУХУ

Пачнем з таго, што менавіта ў гэтай краіне Расейская й Савецкая імпэрыі ракавым чынам атрымалі сьмяротныя прабоіны. Сто гадоў таму тут упершыню сабралася партыя расейскіх рэвалюцыянэраў, якая потым з паражальнай хуткасьцю стварыла на 1/6 сушы найвялікшую за ўсе часы чалавецтва таталітарную сыстэму. У лютым 1917-га адсюль, са стаўкі ў Магілеве, тэрмінова выехаў у Петраград цар Мікалай II, і дарогаю ў чыгуначным вагоне выракся стальцу. Назаўтра Расея выбухнула ў трэскі. Потым быў правальны Берасьцейскі мір. Потым пакт Молатава-Рыбэнтропа. Нарэшце, у канцы 1991 г. СССР рухнуў, і здарылася гэта ў Белавескае пушчы. Заўважце, парэшткі Саюзу незалежныя дзяржавы цырымонна пахавалі ў тым жа Менску. Але на гэтым гісторыя ня скончылася: тут жа з магілы на поўны рост падняўся прывід Імпэрыі зла. Усё з такой убойнай пасьлядоўнасьцю клінам сыходзіцца на Беларусі, што міжволі, як дрыжыкі, прабірае падазрэньне: праўда.

Дзякаваць Богу, геаграфічныя імпэрыі ўсё-такі развальваюцца.

У свой час паў і **Рым**, грандыёзная праэўрапейская мэтраполія. Не засталося й сьледу ад граніцаў, крэпасьцяў, жалезных легіёнаў. Але з [illegible] імпэрыі праз хрысьціянства вызваліліся аграмадныя духовыя сілы, і вось ужо самі пераможцы, гаспадары Сярэднявечча, схіляюцца перад уладаю рымскай цывілізацыі. Антычная культура й каталіцызм, лаціна й рымскае права, сыстэмнасьць і камунікацыі ахапляюць палову зямнога шара. Цэзару й ня мроіліся такія заваёвы.

Пакуль мы яшчэ ня здольныя ў поўнай меры асэнсаваць спадчыну Савецкага Саюзу, але ўжо зараз ясна: наколькі бездухоўным і платаядным быў сам СССР, настолькі ўбогім будзе ягоны ўнёсак у чалавечую гісторыю. Зрэшты, ужо сёньня, на нашых вачох, на дымныя глыбы развальваецца Расея, і мы можам назіраць гэтае відовішча ў прамым тэлеэфіры.

А вось **Ірляндыя** ніколі нікога не акупавала, не спусташала й не абвяшчала тысячагадовых рэйхаў. Маленькая зялёненькая высла ў Атлянтыцы, зь якой жыхары ратаваліся куды падалей. Сёньня Стары й Новы сьвет моляцца на яе. Скрозь ірляндзкія тэмы ў кіно, ірляндзкі тон у кнігах, ірляндзкі рок у навушніках. Найвялікшы раман усіх часоў і народаў родам з Дубліну. Вось так, уявіце сабе: не з Парыжу, Лёндану ці Нью-Ёрку — з Дубліну. Шэсьць нобэлеўскіх літаратараў. Знакамітае О з апострафам у прозьвішчах, быццам бы з коскай перад нулямі гіганцкае лічбы, знакуе сусьветнае захапленьне: О!.. Ірляндыя, якая нават згубіла сваю мову, сталася Культуровай імпэрыяй, Імпэрыяй Духу. А гэта навечна.

Зьместам Імпэрыі Культуры ёсьць ня культ мяжы, не ксэнафобія, не фізыялягічнае паглынаньне народаў ды тэрыторыяў — а наадварот, духовая бязьмежнасьць у суіснаваньні, у імкненьні зрабіць сьвет больш дасканалым. Гэта не элемэнтарная функцыя захопленых квадратных кілямэтраў, а інтэграл куды вышэйшага парадку.

Яшчэ адна Імпэрыя Духу ў нас пад нагамі. І мы, няўдзячныя, топчам яе штодня, дасадліва азіраючы далягляды ў пошуках свае ўласнае Ідэі.

## 2. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ. СТАРЫ ЗАПАВЕТ

Старым Запаветам гісторыі Беларусі быў залаты век Полацку й Вялікага Княства Літоўскага. Гэта сапраўды легенда. Эра мудрых, эра праведных войнаў, герояў і волатаў, раскошных палацаў, яна дайшла да нас у велізарных пыльных кнігах, якія яшчэ чытаць і перачытваць.

Краіна, якая потым стане Беларусьсю, нараджалася на стратэгічным стыку цывілізацыяў, земляробчай Эўропы й качавое Азіі. Гэткім жа чынам сышоўся ў трох кантынэнтах Блізкі Ўсход, прарадзіма

vytoki.net

трох глябальных рэлігіяў. Так падымаецца вяршыня сьвету, Тыбэт з Гімалаямі, дзе сутыкнуліся ўсходнія гіганты, Кітай і Індыя. Важнейшае геапалітычнае скрыжаваньне — гэта гістарычны крыж Беларусі яшчэ з часоў Усяслава Чарадзея. Увесьчас мы аказваліся то між варагаў і грэкаў, то між Кіевам і Ноўгарадам, то між Русьсю й Эўропай.

Менавіта тут, у Эўрапейскай Сарматыі, канцэнтравалася супрацьстаяньне двух сьветаў. У ракавым 13-м стагодзьдзі настаў рашаючы час: у глыбіні дзікіх стэпаў Азіі нарадзілася аграмадная мангольская Арда Тамэрлана, і рушыла на Захад, зьмятаючы на сваім шляху царствы й ханствы... Увадначасьсе зь ёй уваабраўся ў сілу браняваны Ордэн нямецкіх крыжакоў, і памкнуў на Ўсход, разрубаючы Польшчу, Прусію, Лівонію... Дзьве першародныя плянэтарныя стыхіі, такія сугучныя, няўмольна накатвалі насустрач адна адной, каб сысьціся ў двубоі. І ў Міжмор'і, у самае гарлавіне Ўсходняй Эўропы, дзе магло захлынуцца крывёю ў катастрафічным пабаявішчы ўсё сярэднявечнае чалавецтва — раптам, дзіўным чынам, узьнікае магутная дзяржава, Вялікае Княства Літоўскае. І сьняе сусьветнае сутыкненьне. Стагодзьдзе — і перад уладным полем спакою асядае Арда. Яшчэ стагодзьдзе — і ў прах рассыпаецца Ордэн.

Што дзіўна: на гэтай зямлі ўва ўсе часы шукалі, намацвалі тую самую **мяжу** Эўропы з Азіяй: ці то па Дняпры, ці па Бугу, па Вялікім вадападзеле, па Менскім мэрыдыяне... Але важна зразумець: граніцы няма й ня можа быць у прынцыпе. У дрымучай Беларусі зьнікаюць межы. Усё расплываецца ў прывідным сутоньні, перад якім з сумненьнем спыняюцца ўсе заваёўнікі.

Урэшце, Вялікае Княства становіцца лідарам агульнаславянскага **Рэнэсансу**. Беларускія Біблii, друкі й шрыфты, Рэфармацыя й вуніяцтва, віленскае барока й унікальныя рамёствы 16-17 стст. абудзілі магутныя сілы духу ў нашых блізкіх і далёкіх суседзяў. Вялікае Княства Статуту, тэрыторыя парадку — сярод маскоўскае апрычніны, запароскае казаччыны, каталіцкае інкізыцыі й тэўтонскага вераломства. І, што самае дзіўнае, на раздарожжы рэлігіяў, сярод бяздоннага іх памяшаньня, у эру варфаламееўскіх начэй — Княства верацярпімасьці. Ува ўсёй Эўропе катавалі, палілі, вешалі зусім па-жыцейску, а на гэтай зямлі цэлыя стагодзьдзі падобнае было выключэньнем. Сюды натоўпамі сьцягваліся іншаверцы, навукоўцы й гнаныя праведнікі.

Вельмі паказальна, што разваліўся ВКЛ менавіта міжканфэсій-

vytoki.net



нае пытаньне. Калі сілу **веры** канчаткова спаралізавалі царкоўнакасьцёльныя разборкі, калі велічная раскоша пачала па-фарысэйску папахваць разбэшчанасьцю, гэтая краіна ўжо выканала сваю задачу. Эўропа стаяла на парозе прамысловых рэвалюцыяў; Азія трансфармавалася ў Расейскую й Асманскую імпэрыі.

Эпоха Старога Запавету канула ў лету. З Рагвалодам і Рагнедаю, зь легендаю пра Палямона, з мудрымі Саламонамі, гарадзенскім Давідам, са спрадвечнай славай, тысячай казак, якіх больш ніколі ня будзе. Час прыцік.

Сапраўды, геаграфічныя імпэрыі развальваюцца. І шкадаваць ВКЛ ня мае сэнсу. Таму што гісторыя Беларусі пачынаецца зноў — з Новага Запавету.

## 3. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ. НОВЫ ЗАПАВЕТ

Такім чынам, Хрыстос прызямліўся ў Гародні.

Для Беларусі настала **новая эра**. Прабіў час прымружвацца й падстаўляць для ўдару шчокі. Час палюбіць бліжняга свайго ўсім сэрцам, як самога сябе. Час аддаваць.

Мы аддавалі ўсё. Да астатняга таленту, да апошняга слова, так, што самім анічога не заставалася на расплод. Польская асыміляцыя ў Рэчы Паспалітай справакавала цэлы феерверк фэномэнаў беларускага паходжаньня. Мы далі Польшчы найвышэйшыя, найсьвяцейшыя імёны — Міцкевіча, Касьцюшку, Сянкевіча, Манюшку, Агінскага... Захоп вялікалітоўскіх земляў і хваля перасяленцаў на Ўсход выбухнулі неймаверным узьлётам расейскай літаратуры й музыкі 19-20 стст., а гэта, паміж іншага, адна з самых грандыёзных зьяваў у культуровае гісторыі чалавецтва. Беларусы для Расеі зьдзейснілі пераварот у сьветаўспрыманьні: Глінка (расейскі гімн!), Барадзін, Шастаковіч, Стравінскі... Грыбаедаў, Дастаеўскі, Бунін, Твардоўскі, Алеша, Грын, Еўтушэнка,Высоцкі. Прарокі, апосталы, як на падбор. Уявіце сабе, якая павінная быць духовая сіла, каб узьняць Польскую Карону да **Польшчы**, Расейскую імпэрыю да **Расеі**! І ўсё гэта хворая, нямоглая, абрабаваная Беларусь, так-так, тая самая, з каўтуном у валасох. Падумаць, дык яна зрабіла нашмат болей, чым здолела Вялікае Княства. Яна не падначальвала, не насаджала — яна прапаведвала й ачышчала. Яна сваім целам, сваёй крывёю пераўтварала самыя пачварныя дэспаты. Увогуле, цяжка пазбавіцца думкі, што вышэйшая місія Беларусі — гэта прасьвета, ўратаваньне велізарнай грэшнай Расеі: вось так, праз сябе, праз сваю пакуту й боль. Старавойтава і Чубайс, Станкевіч і Маневіч, Кавалёў і Навадворская родам зь Бела-

русі — якія яшчэ імёны патрэбныя, каб гэта зразумець?

Аддалі Вільню. Тым лепш. Хоць захавалі ўласны Ерусалім.

Беларусь судзілі, рвалі на часткі й раскрыжоўвалі межамі. Нашым друкарам ламалі косьці на дыбе; нашы паэты на чужыне харкалі крывёй; нашыя лепшыя галовы лопаліся ад рэвальвэрнага стрэлу ў патыліцу. Пётар І рэзаў, Карл XII паліў, Мураўёў вешаў, Сувораў пароў штыхамі, а Напалеон навальваў груды гарматнага мяса; Сталін расстрэльваў, Гітлер труціў газамі. Білі наводмаш, прыпадкамі, шалеючы, па-садысцку ўпадаючы ў раж ад яе пакорлівасьці. А Беларусь усё падстаўляла твар, і скрозь сьлёзы ўсьміхалася ім. Яна маліла за іх вуснамі сваіх геніяў. Што яна дазваляла з сабой рабіць! — і любіла... Колькі кахалася тут расейцаў, немцаў, французаў, палякаў — многа, ох як многа. Здавалася б, гэтую краіну, яе назву, мову, дый саму памяць аб ёй выгвалцілі й растапталі насьмерць.

Таму неверагоднае ўваскрашэньне ў пачатку 20 ст. усіх проста агаломшыла. Той нацыянальны рух чысьцейшай вады, які ўзьнік надзіва ймкліва, чарговы раз прымушае нас паверыць у цуды.

І прыслухацца, як прароча, пачынаючы яшчэ з Багушэвіча, гучаць прозьвішчы. Багдановіч. Адамовічы. Данчык.

## 4. БЕЛАРУСЬ — ГЭТА СЬВЯТОЕ

Па ўсім былым Саюзе да беларускага й Беларусі пачуцьцё асаблівае, дзіўнае і шчымлівае. Знакаміты працаўнічок трактар, родныя "Песьняры", вайна па-быкаўску — гэта **сьвятое**, вам скажа кожны савецкі чалавек. Вельмі характэрна ў расейцаў: ім так няёмка, што часам яны стараюцца заглушыць сваю віну перад беларусамі грубым, армейскага кшталту, пакрыкваньнем. Але нават горкая маскоўская інтэлігенцыя раз-пораз, пасьля трэцяе-чацьвёртае чаркі, уроніць сьлязу за Беларусь, самую чыстую, самую славянскую, краіну крыніцаў з самай празрыстай у сьвеце мовай.

Гэта вельмі нагадвае мне адзін жыцьцёвы вобраз. Мой сябра, ціхенькі аднакурсьнік, са сьціжмай такіх жа бяскрыўдных, як першыя хрысьціяне, **братоў**, прапаведваў Біблію ў мэтро й пераходах. Зь яго бязьлітасна кпілі, грэбавалі амаль усе — і трэба было бачыць прыніжэньне гэтых людзей, калі ён шчыра й пакорліва дапамагаў ім у бядзе! Ува ўсіх справах, якія патрабавалі справядлівасьці й сумленьня, аўтарытэтам заўсёды аказваўся ён, самы праваддны, пастаянна крыўджаны.

Штосьці найвышэйшае ёсьць у гэтае пяшчотнае беларускае цярплівасьці, у гэтай вечна вінаватай усьмешцы. Пасьля усіх зьдзекаў,

vytoki.net



катастрофаў і кашмарнага генацыду гэта ўражвае, аж да дрыжыкаў. Гэта ня проста забітасьць, і не **забытасьць**. Гэта куды глыбей. Беларус, братка. **Братні** народ. Не такія ўжо пустыя словы, як здаецца — ці ня праўда?

"На Беларусі Бог жыве",— сказаў Караткевіч, вялікі прарок. Ягоныя вершы й проза гучаць так узвышана й на першы пагляд крыху наіўна, але ў караткевіцкай простай мудрасьці прадоньне сэнсу. І нават болей: у ім вера. Бель Белай Русі змушае ўспомніць анёлавы крылы.

Гэта праўда: усе канфэсіі, якія прыходзілі на Беларусь раптоўна гублялі свой агрэсіўны зарад, і запавольваліся, і нямелі перад гэтай сапраўднай незямной сілай. Для фармальнае рэлігіі ўраз губляліся ўсе арыентыры, і непарушныя догмы дымам распушчаліся ў паветры. Гэта тут юдэі мірна суседзілі з мусульманамі, тут сьсякла магутная плынь кальвінізму, тут загрузла падбрушша праваслаўя, і энэргічныя айцы-езуіты няўцямна блукалі ля тлеючых паганскіх вогнішчаў, спрабуючы ўцяміць, у чым жа рэч.

Ня сьмейце казаць, што ў гэтага Народу няма за душой нічога сьвятога. Быццам Ён сьпіўся, дэградаваў, хворы, замбіяваны, быццам Ён даўно ўжо не народ і яшчэ чортведама што. Я назіраю нават у апошніх п'яніцаў: даходзіць да Беларусі — і стоп. Далей ні-ні. Беларусы памоўкваюць, бо ведаюць, наколькі сур'ёзная іх адказнасьць перад сваёй зямлёй і ўсім гэтым сьветам. "Беларусь" — чуеце, як цёпленька? У нас гэтае пачуцьце не палае, ня жарыць, яно далікатнае й трапяткое, як сьвечка.

Проста **Беларусь — гэта сьвятое**.

## 5. БОЛЬ ЭЎРОПЫ

Дзе б ні кранулі Беларусь, паўсюль у адказ чуйна кальне **боль**. Усё што пра нас ведаюць у сьвеце — рэзаныя, рваныя, разможаныя раны: Курапаты, Брэсцкая крэпасьць, Хатынь, Чарнобыль. Кожны эўрапеец інстынктыўна, амаль фізычна адчувае гэтую вобласьць нычочай памяці, для яго гэта "дзесьці там", і ён трапна пацэліць пальцам на мапе, дзе гістарычна баліць небясьпека.

Беларусь ные, як сэрца. Маскве, Брусэлю, Страсбургу, Бэрліну робіцца не па сабе з кожнай позвай нашага болю. Помніце, як ёкнула сардэчка ўвесну 1996 г. — усе Баўканы здрыганулiся мнагатысячнай сутаргай. Сэрбія, Баўгарыя, Альбанія валяліся ў жорсткіх корчах аж да самай вясны 97-га.

Ува ўсёй Эўропе няма больш **трагічнага** Адраджэньня, чым

беларускае. У прыбалтаў, палякаў, чэхаў і нават румынаў увесь нацыянальны арганізм, будзь здароў, працаваў на Resistance ды Renaissanse, і крызыс хваробы вырашыўся напружаньнем у лічаныя дні. Для беларусаў гэтая насалода болю цягнецца ўжо другі дзясятак гадоў, і канца-краю не відаць. Нашае Адраджэньне ажыцьцяўлялася такім выключным міззрам сілаў, на такім фальцэце, такімі непадымнымі й адчайнымі вымогамі, што жылы трымцелі, як нацягнутая ніць. Гэтая нота, нясьцерпна тонкая й высокая, бярэ за жывое так, што хочацца плакаць. У мяне перад вачыма Пазьняк з растрапаным валосьсем, у насьпех зацыраваным плашчы, поплеч з Клінтанам на краі курапацкае ямы, а ўвушшу — пранізьлівы віск дзяўчыны, якую выцялі гумовым дубіналам на Чарнобыльскім шляху!..

Паглядзіце ў вочы любому беларусу. Такое ўражаньне, што ён пастаянна цярпіць боль.

Беларусь — вечнае прытулішча гнанага адусюль гэбрайства. На гэтай зямлі разьмясьцілася адна з самых пладавітых дыяспараў у сьвеце. Тут радзіма знакамітых ізраілявых правадыроў: першага прэзыдэнта Хаіма Вейцмана, трэцяга — Залмана Шазара, прэ'ер-міністраў Мэнахема Бегіна, Іцхака Шаміра, Шымона Пэрэса. Тут айчына Шагала, Антокальскага, Суціна, бацькаўшчына хасыдызму. Увогуле, беларускае гэбрайства — тэма асобнае гутаркі, патэтычнай і ўзьнёслай. А там, дзе такі ўздым абранага Богам народа, там, дзе адвечны жыд знаходзіць абжытую абяцаную зямлю — чакай вялікае таямніцы. І болю.

Беларусі, укрыжаванай між Эўропай і Расеяй, ня суджана стаць дамашняй, дабрапрыстойнай сярэднеэўрапейскай краінай. Нельга паверыць у тое, што ўсё надрыўнае змаганьне йшло за сытае пахлопваньне па бруху й падстрыжаны газон пад вокнамі. Зараз, вы толькі паглядзіце, вакол нас ізноў клубяцца трывожныя прадчуваньні, хваравіты азноб ходзіць ходарам. Баюся, гісторыя толькі пільнуе часу, каб ізноў разрадзіцца чарговай катастрофай у нашае няшчаснае Беларусі. І зноў будзе балюча.

## 6. АДВАРОТНЫ ЭФЭКТ

Яшчэ адзін фэномэн Беларускае Ідэі, які так відовішчна фантануе апошнія гады — эфэкт **Лукашэнкі**. Варта было Лукашэнку прыйсьці да ўлады, і краіна адразу апынулася ў эпіцэнтры грандыёзных постсавецкіх працэсаў. Позвы вяртаньня Імпэрыі зла, узнаўленьня Ўсеславянскага саюзу на ўвесь голас прагучалі менавіта тут. І, нечакана для ўсіх, набылі пужаючае водгульле — ад Усхс

зу.

vytoki.net



Сапраўды, і гэтая гістэрычная фантастыка на прэзыдэнцкіх выбарах, і панславісцкае рэха, і велізарныя псыхатропныя рэакцыі ад Брэсту да Курылаў парадаксальным чынам сьведчаць усё пра тое ж: пра незвычайную геапалітычную й духовую сілу Беларусі як генэратара, яе мабілізацыйную магутнасьць і сусьветныя маштабы.

Трэба аддаць кесару кесарава, *Лукашэнка* з самага пачатку ацаніў магію сілы, аб існаваньні якой іншыя проста не здагадваліся. Ёсьць ад чаго здрыгануцца: мэсіянская роля Беларусі прагаворана ў ракавы двухтысячны час, і — увага! — пагроза рэальная, як заўтрашні дзень. Пастаянна варта помніць, што тайна Расейскай імпэрыі заключаецца не ў маскоўскім Крамлі, піцерскім Зімнім ці ніжагародзкім кірмашу. Менавіта ў нашай з вамі Беларусі вырашаецца надта ўжо многае, калі ня ўсё, і нам нікуды ад гэтага ня дзецца.

КГБ тонка падабраў камэртон, на якім рэзананс Ідэі становіцца разбуральным і выклікае цыклапічныя земляўздрыгі. Усё імгненна становіцца з ног на галаву, гіганцкія піраміды рушацца, і насельніцтва ахоплівае павальная паніка — прыкладна так, як гэта здарылася 17 жніўня ў Расеі. Перайначыць знак на супрацьлеглы аказалася гэтак жа проста, як перавярнуць 1999 год у страшную апакаліптычную *лічбу*.

А мы з вамі толькі-толькі намацваем нашую ноту, трагічную й высокую, якая павінная ўсё расставіць па сваіх месцах. Нам трэба, чаго б гэта не каштавала, пацэліць у гэты ірацыянальны пункт, і выклікаць верны эфэкт.

Зрэшты, Імпэрыя Духу, Імпэрыя Культуры тым і розьніцца ад любой звышдзяржавы, што транскантынэнтальныя ракеты тут замяняе **трансцэндэнтальнае** мысьленьне. Тут дзейнічаюць катэгорыі, якія не падначальваюцца законам жалезнае лёгікі. Глябальныя эфэкты спрацоўваюць у імя духоўнасьці — так, як гэта неаднойчы ў сусьветнай гісторыі дэманстравала Нацыянальная Ідэя.

## 7. ІДЭЯ

Раз-пораз нават здаецца, што яшчэ сэкунда, і мы вось-вось спасьцігнем, скрышталізуем для сябе гэты момант ісьціны: настолькі празрыстая яго сутнасьць, настолькі ясна паблісквоюць, граюць грані чагосьці ідэальна цэласнага, так працінае — да іскрыстых сьлёзаў, да галюцынацыяў. І я ўвесь час паўтараю пра сябе: Беларусь чакае вялікая будучыня.

Трэба памятаць:

— Беларуская Нацыянальная Ідэя — трэба памятаць: гэта ідэя

пакутнай і вялікай краіны, у якой мы **маем гонар** жыць, краіны, якой пастаянна балюча й якая, хутчэй за ўсё, ніколі ня стане шчасьлівай.

— Беларуская Нацыянальная Ідэя — гэта ідэя Новага Запавету: Веры, Надзеі, Любові. Не ўзбуджэньне гневу, не інквізыцыя супраць маскоўскае ерасі мусіць быць нашым дэвізам. Беларусы — носьбіты ўнікальнага, **хрысьціянскага** ў сваім прынцыпе духоўнага **імпэратыву**, які й ёсьць сэнсам нашае Імпэрыі Культуры. Як гэта ня цяжка, нам трэба ўспрыняць, што краіна, як і чалавек, не павінная жыць **для сябе**. Яе задача — даць сябе іншым, і праз гэта сцьвярджаць сваю веліч. Прасьвятляць і настаўляць аграмадную Расею, уздымаць Усходнюю Эўропу — на нашым сумленьні. Так павялося спрадвеку, так будзе й далей.

— Урэшце, Беларуская Нацыянальная Ідэя — гэта ідэя Імпэрыі Культуры, буйнейшага духоўнага цэнтру Ўсходняе Эўропы. Гэтая краіна прызваная лучыць і вучыць увесь кантынэнт, у болях спараджаючы ўсё новыя й новыя хвалі эміграцыяў, драмы й найвышэйшае культуры. Гэта краіна геніяльнага **Міжмоўя**, дзе чыста беларускі элемэнт выконвае ролю магічнага крышталю, люстранога пачатку каардынатаў. У яго **фокусе** сыходзяцца элітарныя культуры й масавыя псыхозы паловы Эўропы. Тэлевізія, інфармацыйныя тэхналёгіі й выбух камунікацыяў даюць нам беларускі фокусны сынтэз — той звышэфэкт, дзеля якога робіцца цяперашняя карпатлівая праца "Народнага Альбому", "Маладога Адраджэньня" й сучаснае "Нашай Нівы".

Зь беларускіх лясных шоргатаў і шэптаў, у эфіры бясконцых шумоў, у інфармацыйным сутоньні, з туману трэцяга тысячагодзьдзя насустрач нам узьнікаюць абрысы гэтае аграмаднае культуровае Імпэрыі — як гара сярод аблокаў, яна патыхае халадком абсалютнай ідэі. Масква, Варшава, Кіеў, Вільня — толькі велізарныя фарпосты, краевугольнае крэпасьці яе смутнай магутнасьці.

Няма й ня можа быць сумневаў: Нацыянальная Ідэя ў рэшце рэштаў пераможа. Ува ўсіх абвостранае адчуваньне, што час працуе на нас. Нам ня трэба баяцца, што гэтая краіна зьнікне з мапаў ці зробіцца каляніяльным закалусьцем. Расея, ды й ніхто іншы, ня ў сілах зьнішчыць ані нашую дзіўную вялікую нацыю, ані яе цудоўную мову. У нас усё атрымаецца. Трэба толькі быць простымі й сумленнымі, ашчаднымі ў гневе й шчодрыі ў любові; трэба шукаць, грукацца ўва ўсе дзьверы, верыць і абавязкова ўсьміхацца.

* * *

А ў астатнім — усё, як у Пазьняка.

vytoki.net





**АЛЯКСЕЙ ЯНУКЕВІЧ,**
**ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ**

# БЕЛАРУСКАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ ІДЭЯ

*Зусім нядаўна Аляксандар Лукашэнка заявіў на ўсю краіну, што, калі старыя кадры ўва ўрадзе не справяцца з эканамічным крызысам да Новага году, то ўсе яны пойдуць у адстаўку, а іхнае месца зоймуць* ***маладыя****. Як вядома, наш прэзыдэнт фэнамэнальна адчувае грамадзкія настроі й чаканьні, і таму над ягоным пасажам варта прызадумацца. Сапраўды, сёньняшнюю ўнутраную й вонкавую эканамічную палітыку краіны вызначае старая, камуністычная намэнклятура, чынавенства, ўзрост якога складае 60-70 і болей гадоў. Менавіта гэтае пакаленьне кіруючых пэнсіянэраў трымае рэжым, менавіта яно нагнятае падзабыты савецкі дух чэргаў і палітынфармацыяў, і менавіта яно не выпускае ўладу са сваіх зданцьвелых, паўмёртвых абдымкаў вось ужо колькі дзесяцігодзьдзяў. У 1994 годзе грамадзтва, стомленае гэтай пажылой, перадынфарктнай ўладаю прагаласавала за самых маладых, самых, здавалася б, сьвежых. Але выбрала ўсё тое-ж. Таму сёньняшнее пытаньне, якое нязьмольна насьлявае й якое так востра прадчувае Лукашэнка, гучыць так: "Хто прыйдзе на зьмену?"*

*А прыйдуць менавіта маладыя. Прыйдзе новая хваля — тая, якая ўжо валадарыць у Эўропе: Тоні Блэр, Гергард Шродэр, Аляксанд Квасьнеўскі. Тая, што захлынулася ў Расеі: Гайдар, Чубайс, Нямцоў, Кірыенка. Якой жа праз некалькі гадоў будзе нашая новая беларуская хваля?*

*Сёньня мы прапануем вам зірнуць на будучыню Беларусі, вобразна кажучы,  з вышыні птушынага палёту — вачыма маладых. Свае гледзішча — можа быць , занадта сьмелае й нават дзёрзкае, а можа, і проста ўпэўненае — прапануюць лідэры Маладога Фронту эканаміст Аляксей Янукевіч і журналіст Павал Севярынец.*

## СТАРТАВЫ КАПІТАЛ

Беларусь — адзін з патэнцыйных эканамічных цудаў Эўропы XXI стагодзьдзя. Нашая краіна мае усе перадумовы для моцнага рэактыўнага старту.

Па-першае, гэта выдатнае эканоміка-геаграфічнае **становішча** — між краінамі СНД і Эўропай, між Балтыйскім і Чарнаморскім рэгіёнамі. Беларусь — ключавое зьвяно ня толькі ў сыстэме эўрапэйс-

ка-расейскай бясьпекі, але й самы пэрспэктыўны плацдарм для разьвіцьця й экспансіі эканомікі Усходняе Эўропы. Пра гіганцкую геапалітычную сілу Беларусі сьведчаць і знакамітыя транзытныя калідоры, і шляхі ці ня ўсіх апошніх войнаў, і пільная ўвага сусьветнай грамадзкасьці да сёньняшніх беларускіх працэсаў. Зрэшты, і ўнутраная структура беларускага унікума — радыяльная эканоміка-геаграфічная канфігурацыя са сталіцай у самым цэнтры, на скрыжаваньні важнейшых камунікацыяў, з буйнымі прамысловымі вузламі на стратэгічных накірунках — цудоўная матрыца для стварэньня тэхналягічнага, фінансавага й інфармацыйнага сэрца рэгіёна.

Другое — **людзі**. Беларусь мае найвышэйшы сярод суседзяў працэнт кваліфікаванага працоўнага насельніцтва. Ён дастатковы для разгортваньня навукаёмістых і працаёмістых галінаў вытворчасьці наўзамен энэрга- й мэталаёмістых, для арганізацыі шырокае сучаснае невытворчае сфэры сэрвісу й абслугоўваньня. Працавітасьць беларусаў увайшла у савецкі й эўрапейскі фальклёр — і гэта наш найважнейшы рэсурс, які варта выкарыстоўваць.

Трэцяе — **прыродныя рэсурсы**. Любы спэцыяліст пацьвердзіць вам, што Беларусь мае дастаткова стратэгічных рэсурсаў для разьвіцьця нармалёвай, эўрапейскага тыпу, эканомікі, і нават для экспарту за мяжу. Гэта, у першую чаргу, знакамітыя салігорскія **солі** (пры комплекснай распрацоўцы гэтае буйнейшае у Эўропе радовішча здольнае даваць не дзясяткі, а сотні мільёнаў даляраў цьвёрдае валюты). Гэта самыя разнастайныя будаўнічыя матэрыялы (гліна на цэглу й цэмэнт, пяскі, вапнякі й крэйда, мікашэвіцкі друз і абліцоўка). Гэта жалезныя руды (Окалаўскае й Карэліцкае радовішчы здольныя забясьпечыць Беларусь чорным мэталам). Гэта торф, бурыя вуглі, даляміты, фасфарыты, рэдкія землі й некаторыя каляровыя мэталы. Велізарнае значэньне маюць мінэральныя воды, сапрапэлі й цудоўны беларускі лес. І, урэшце, **зямля**, амаль па гектары ворнае зямлі на кожнага працаздольнага беларуса — і гэта ў даволі цеснай Эўропе! Іншая справа, што ў часы СССР гэтыя багацьці альбо выграбаліся драпежніцкім чынам (солі, торф), альбо проста не распрацоўваліся, бо не цікавілі імпэрскага монстра ВПК.

Чацьвёртае — вядомасьць, "раскручанасьць" краіны. Не зьдзіўляйцеся, тая антырэклама, якую робіць Беларусі цяперашні рэжым, адыгрывае аграмадную ролю "на будучыню" — для таго, хто будзе пасьля. Беларусь, да якой сёньня прыцягнутая ўвага сусьветнае супольнасьці, заўтра мае ўсе шанцы атрымаць шматмільярдныя ўліваньні



vytoki.net



адразу па зьмене ўлады. Памяняць знак "-" на "+" — справа тэхнікі. Велічыня застаецца: вось вам, як прыклад, Чылі, ПАР ці Эстонія.

## БЕЛАРУСКІ ЭКАНАМІЧНЫ ЦУД

Такім чынам, цудоўнае геапалітычнае разьмяшчэньне, кампактная й арганізаваная тэрыторыя, адукаванае й працавітае насельніцтва дазваляюць зараз разьлічваць на выдатную пэрспэктыву Беларусі ў ракурсе XXI ст.

Сёньня нашая краіна ўяўляе сабою аграмадны палітыка-эканамічны **вакуум** у цэнтры Эўропы, куды гатовыя хлынуць магутныя капіталы й зацікаўленыя інвэстары. Пры ўмове стабільнага дэмакратычнага ўраду — а такі ўрад рана ці позна ў краіне ўсталюецца — Беларусь робіцца адкрытай арэнай скрыжаваньня глябальных інтарэсаў — Эўропы й ЗША, Расеі й Нямеччыны, Украіны й Прыбалтыкі — і, як сьледзтва, прыцягненьня канкурэнтных капіталаў. Прыгадайце гісторыю азіяцкіх "тыграў" — цуды стварае менавіта міжнародная геапалітыка.

Спачатку будзе дасягнутая **фінансавая стабілізацыя**. Сёньня ўсім ясна, што бяз вонкавых пазыкаў і ўнутранае шокавае тэрапіі на першым этапе не абыйсьціся: да такога стану давездзеная эканоміка расейскім перакосам і камуністычнай спадчынай. Будзе патрэбная жорсткая падатковая палітыка разам з раскруткай ідэі свабодных эканамічных зонаў, адмаўленьне ад дзяржаўнага крэдытаваньня стратных калгасаў-саўгасаў пры падтрымцы фэрмэрства, увядзеньне рэжыму эканоміі й бязьлітаснай працэдуры банкруцтва адначасова з распачынаньнем маштабовых структурных рэформаў. Усе гэтыя меры, увязаныя ў пасьлядоўную выканаўчую сыстэму й спалучаныя з уздымам прыватнай ініцыятывы разьняволенага грамадзтва, здольныя забясьпечыць аптымальныя варункі для **інвэстыцыяў** — пераважна замежных, але часткова і ўнутраных.

Гэтаму будзе спрыяць і геапалітычная раскладка на кантынэнце: актыўнае ўвядзеньне у абарот грашовай адзінкі euro і ўзмацненьне Нямеччыны з натуральнай эканамічнай экспансіяй на Ўсход будзе вымагаць ад ЗША больш канкрэтных і рашучых крокаў дзеля стварэньня "даляравага кардону" паміж Заходняй Эўропай і Расеяй (альбо тымі дзяржавамі, што ўтворацца пасьля яе развалу). У гэтай плянэтарнай камбінацыі важную ролю зноў суджана выканаць Беларусі. У той жа сфэры геапалітыкі палягае вырашэньне славутага транзытнага пытаньня й праблемы нафтавага калектара.

Акумуляцыя **фінансавых рэсурсаў** з Усходу й Захаду ў беларускіх **банках** будзе мець выключнае значэньне. Інвэстары будуць зацікаўленыя ў стабільнасьці ў краіне й на яе межах (прыклад: Швайцарыя падчас Другой сусьветнай вайны, Японія на працягу "халоднае" вайны).

Цэлым шэрагам падымуца свабодныя эканамічныя зоны (найлепшымі варыянтамі выглядаюць Горадня ў зўрарэгіёне "Нёман", Берасьце як "Брама на Захад", Полацак-Наваполацак на стыку прыбалтыйскіх і расейскіх інтарэсаў, Гомель ў трохкутніку Беларусь-Украіна-Расея, Ворша й уласна Менск). Такім чынам, Беларусь стане усходнеэўрапейскім "круглым сталом", выстаўным павілёнам са сваімі Давосамі, Кран-Мантанамі... Заслаўе, Мір, Віскулі — чаму б і не? Гэта пацягне за сабой яшчэ большае разьвіцьцё сфэры паслугаў (гатэлі, рэстараны бізнэс ды індустрыя адпачынку), што зробіць, урэшце, магчымым разгортваньне шырокае сеткі турыстычнага бізнэсу й рэстаўрацыю легендарных гістарычных і архітэктурных комплексаў.

Кампутары, інфармацыйныя прадукты, побытавая тэхніка, найноўшыя прэпараты Made in Belarus — вось будучы галаўны боль ЗША й Японіі. Гэта будзе. Трэба толькі ведаць, як узяцца за справу, і многа, умела, **па-беларуску** працаваць.

Зрэшты, эканамічны цуд на той й цуд, што здараецца нечакана. Прарыўна, раптоўна, па-маладому. Так будзе й гэтым разам.

## АДРАДЖЭНЬНЕ РОБІЦЦА ПРАГМАТЫЧНЫМ

Ува ўсе часы Беларускае Адраджэньне насіла выразна акрэсьленыя **рамантычныя** рысы. Самаахвярнасьць, інтэлігенцкі энтузіязм і наіўны аптымізм былі рухавікамі й найноўшага пэрыяду беларусізацыі, які пачаўся з канца 80-х і доўжыўся да вясны 1996 г. Прагматыкі, якія раптам трапляліся ў шэрагах беларускіх адраджэнцаў, праз пэўны час ціха адыходзілі ўбок, пакідаючы за сабою добрыя, з адценьнем смутку, успаміны. Між тым, першачарговай прычынай паразы стаў менавіта недахоп прагматызму — як палітычнага, так і эканамічнага.

Новая хваля Адраджэньня Беларусі павінная ўзьняцца ў хуткім часе, і зьвязаная яна будзе, натуральна, з **моладзьдзю**. Той, якая сфармавалася ў атмасфэры толькі што набытае свабоды й вольнага выбару, без ідэалягічных склерозаў і радыкулітаў, з праэўрапейскім сьветапоглядам. І першы з гэтых прынцыпаў, які так наглядна дэманструе сёньня маладое пакаленьне — **прагматызм**. На нашую



vytoki.net



думку, ён не супярэчыць ідэі Адраджэньня, а проста надае ёй рацыянальнае, простае й мудрае скіраванасьці. Беларуская Нацыянальная Ідэя набывае ня толькі духоўны, але й матар'яльны аспэкт. Таму на сьцягох будучых пераменаў вялікімі літарамі будзе напісана: "**Беларусы! Узбагачайцеся!**"

Сапраўды, дзяржава, якой бы моцнай яна ні была, ня здольная забясьпечыць дабрабыт хаця б большыні сваіх насельнікаў. Дзяржава — такая сыстэма, што можа зрабіць усіх сваіх падданых беднымі альбо няшчаснымі, але шчасьлівымі й заможнымі — ніколі. Будучыя ўрады незалежнае й дэмакратычнае Беларусі мусяць сканцэнтраваць сваю ўвагу на непасрэдным клопаце пра тых грамадзянаў, што з пэўных прычынаў (стан здароўя, узрост) ня могуць паклапаціцца пра сябе самастойна. Для ўсіх астатніх неабходна як мага больш хуткае й рашучае стварэньне спрыяльных варункаў дзеля гаспадарчае дзейнасьці й жорсткія гарантыі недатыкальнасьці прыватнай уласнасьці.

Праграмы, паводле якіх праз два гады кожны жыхар краіны будзе мець пэўны, напрыклад, 300 даляраў, штомесячны заробак, ня толькі невыканальныя, але й псыхалягічна шкодныя: яны забіваюць прыватны прагматызм і завязваюць асабісты дабрабыт кожнага выключна на дзяржаўным клопаце. "Мы дадзім вам магчымасьць законна зарабляць 1000 даляраў у месяц!" — такі лёзунг для кожнага беларуса будзе ня толькі больш шчырым, але й прывабнейшым нават зь меркаваньняў здаровага папулізму.

Ня трэба, выбіваючыся зь сілаў, змагацца за шчасьце народа (дарэчы, з самым народам). Трэба проста даць гэтаму народу магчымасьць займацца сваім шчасьцем асабіста.

Сёньняшнія маладыя, якія адукуюцца ў Эканамічным Унівэрсытэце, БДУ й недзяржаўных інстытутах, вучацца быць упэўненымі ў сваіх сілах. Яны стаяць за дэмакратыю, за незалежнасьць Беларусі у Маладым Фронце й Грамадзянскім Форуме. Яны праходзяць усе неабходныя выпрабаваньні, каб пасьля ўзяць на сябе цяжар будучых рэформаў і прайсьці шлях ад разоранай, падаўленай краіны да разьвітое, заможнае эўрапейскае дзяржавы.

АЛЯКСЕЙ ЧАРНЯЕЎ

# ПРАГРАМА НАШАЕ БУДУЧЫНІ

## ЭПОХА ІНФАРМАЦЫІ

У дачыненьні да нашага часу часьцяком ужываюцца розныя гучныя тытулы накшталт эра *чагосьці-вельмі-пэрспэктыўнага-й-важнага*. На ролю хітоў века высоўваліся камунізм, генэтыка, астранаўтыка, рок-н-рол, атамная энэргетыка й даўгі шэраг дробных да незаўважнасьці ідэяў і зьяваў. Можна ўпарта спрачацца наконт пэрспэктыўнасьці альбо навуковае важкасьці "намінантаў", але вызначае лідэра практычнае жыцьцё. Гэтак, атамная энэргетыка адзначыла стагодзьдзе бруднымі плямамі, прыбіраць якія давядзецца тысячы гадоў. І ня дзіўна, што ў пасьпалітага чалавека кожны ядравы праект выклікае стрэс, нібы зараджаны пісталет ля скроні. Генэтыкі скапіявалі авечку, чым адразу справакавалі выбух нейкага нездаровага інтарэсу — а ці нельга зрабіць другога Гітлера альбо Сталіна? Як у "Іван Васільевіч зьмяняе прафэсію": "А сцэначку ў краме прыпадняць можаце?". Кажуць, існуюць грандыёзныя пэрспэктывы ў далечыні, але мы лепш азірнемся навокал — што ўжо ўплывае на лёс чалавецтва. Мне падаецца, лідэр тут неаспрэчны — кампутар.

Стварэньне прылады, якая прызначаная проста апрацоўваць інфармацыю, нягледзячы на нескладанасьць ідэі, сталася сапраўды эпахальнай падзеяй. Рэч тут ня ў той зручнасьці й унівэрсальнасьці, якія дазваляюць ужываць кампутар ува ўсіх сфэрах чалавечага жыцьця ад складаных навуковых досьледаў да гульняў і гатаваньня стваваў. У сапраўднасьці ўсё глыбей: адбылося адкрыцьцё новага вымярэньня — прасторы інфармацыі,— асвойваньне якога яшчэ толькі пачынаецца, у кантакце зь якім пераўтвараюцца, мадэрнізуюцца й абнаўляюцца бізнэс, навука, культура. Тут зьяўляюцца ня толькі новыя працоўныя месцы, але й новыя спэцыяльнасьці: web-майстры, праграмісты розных кірункаў, кампутарныя дызайнэры й г.д. Гэтак, новы сьвет інфармацыі й тэхналёгіі прывёў да стварэньня суцэльнай індустрыі, шчасьлівая спэцыфіка якой палягае ў нізкім спажываньні энэргіі й прыроднае сыравіны. Адзіны, бадай, рэсурс які вызначае багацьце краіны ў гэтым вымярэньні — інтэлект.

## ЭПОХА БЕЛАРУСІ

Загаловак ажно блішчыць ад маладога нахабства, але гэта сапраўды так. Беларусь — патэнцыйны лідэр у галіне інфармацыйных



vytoki.net



тэхналёгіяў на абшару бадай што ўсяе Эўропы. Яшчэ за часамі СССР Беларусь вызначалася як рэспубліка з найвышэйшаю доляй высокаадукаванага насельніцтва. Не ў апошнюю чаргу дзякуючы высокай колькасьці спэцыялістаў-электроншчыкаў і праграмістаў. Нашая краіна забясьпечвала кваліфікаванымі кадрамі стратэгічныя вытворчасьці й дасьледваньні: НДІСА (Навукова-Дасьледчы Інстытут Савецкай Арміі), завод імя Арджанікідзэ, "Інтэграл", Інстытут кібэрнэтыкі — гэта толькі буйнейшыя такога кшталту ўстановы Менску. Падрыхтоўка кадраў наладжаная трыма ВНУ: Радыётэхнічным інстытутам (цяпер БелДзяржУнівэрсытэт Інфарматыкі й Радыёэлектронікі), Палітэхнічным інстытутам (цяпер Акадэмія) і БДУ. Нашыя спэцыялісты ўдзельнічалі ўва ўсіх найважнейшых навукова-тэхнічных праграмах у Навасібірску, Маскве, Кіеве. Ня дзіва, што й нефармальнае кампутарнае асяродзьдзе склалася ў Менску даволі рана (старыя хакеры сьцьвярджаюць, што ў часе мы саступілі толькі Кіеву), і заўсёды вызначалася рэдкім прафэсіяналізмам. Нядрэнна ўсталявалася й нябачная прамысловасьць саматробных кампутараў (дарэчы, гэты занятак у нас мае старыя традыцыі: адна з найпершых мэханічных вылічальных машынаў была зробленая ў Нясьвіжы ў XVIII ст.)

На жаль, сёньняшні рэжым, пазбавіўшы Беларусь здаровага бізнэсу, пакінуў без працы значную частку таленавітых беларускіх кампутаршчыкаў. У нудзе "рынкавага" сацыялізму застаецца спраўджваць свае здольнасьці ў дэструктыўных праграмах — вірусах і траянцах. Некаторыя спэцыялісты зьехалі на працу ў замежжа, але ў гэтых слаях эміграцыя не набыла таго абвальнага характару, як, дапрыкладу, ў беларускім спорце. Магчыма, патлумачыць гэтае ўпартае нежаданьне пакідаць Радзіму дапамогуць вынікі сацыялягічных дасьледваньняў праведзеных Маладым Фронтам у маладзёвых асяродках рознай прафэсійнай арыентацыі — сярод праграмістаў паказьнікі нацыянальнай сьведамасьці й патрыятызму вышэйшыя за сярэднія на 10–15%. Так што гэта ня проста ўпартасьць — гэта нашая, БЕЛАРУСКАЯ ўпартасьць.

Зрэшты, гэта прагматычныя людзі з разьвітым інтэлектам, і яны папросту даўно пралічылі на кампутарах — дыктатура доўга не пражыве. Зараз патрэбная праца дзеля разьвіцьця й удасканаленьня галоўнага беларускага капіталу — мазгоў. Ёсьць усе варункі для адраджэньня беларускае дзяржаўнасьці менавіта на гэтай урадлівай глебе — тэхнічнай інтэлігенцыі. Ёсьць усе варункі, каб дзяржава, забясьпечаная такой колькасьцю адмыслоўцаў, як Бе-

ларусь, сталася тэхна-інфармацыйным цэнтрам сусьветнага маштабу. Не забывайма, што тэхналягічны ўздым узьнімае на новыя вышыні банкаўскую справу, бізнэс у сфэры абслугоўваньня, навукаёмістую вытворчасьць.

Аўтар займаецца тэхнічнымі пытаньнямі дзейнасьці Маладога Фронту два гады. За гэты час я пацісну́ў рукі, паразмаўляў і папрацаваў ня менш як з паўтысячай калегаў-праграмістаў, выслухаў і таго больш. Бальшыня зь іх думае так, як я вам тут выклаў, і яны, проста дзеля сябе, гатовыя зрабіць гэтую найпрыгажэйшую й найразумнейшую краіну яшчэ й найбагацейшай. Таму, як чалавек, які ня проста верыць, але які ведае, я вам кажу: будучыня за намі. Справа толькі за арганізацыяй і працай.

vytoki.net



ПАВЕЛ СЕВЕРИНЕЦ

# ПОПРОБУЙ БЕЗ ЯЗЫКА.

## Рецепт самого дорогого деликатеса в мире

*Очень вас прошу, когда-нибудь сделайте это. Встаньте перед зеркалом (ноги на ширине плеч) и высуньте язык, да побольше. Вываливайте, не стесняйтесь! Внимательно присмотритесь: какой же он свежий, багровый, с пупырышками... А теперь попробуйте-ка сказать что-небудь, держа его, родного, на весу. По Тургеневу как-то получается: в смысле: не "великий и могучий": а какое-то му-му. Нет, такой язык нам не нужен!*

*Вообще-то разговаривать без языка просто. Надо только иметь желание, и вполне можно будет обойтись без этого красного гада. Мы же все-таки беларусы. И наша* ***мова****, о которой пойдет речь, рождается вовсе не в ротовой полости, среди размножающихся кислотных бактерий, а в глубинах мозга, где таится генетика рода и заключается секрет вашей собственной психической гармонии и полноценности.*

### ЛИЧНЫЙ ОПЫТ

В школе я своей родной бел. мовы, как и полагается, брезгливо сторонился: угораздило, понимаешь, иметь за душой нечто глубоко попахивающее деревенским огородом. Соответственно, выражаться по-беларуски считалось пристойным только где-нибудь в кабинете бел. лит.

Для кого-то озарением в этой тьме была книга, кто-то начал "поговаривать" под влиянием друга, Некоторые из тех, кого я знаю, перешли на мову после референдема-95 или многотысячных манифестаций весны-96. Для меня — вдруг, неожиданно, будто из-за угла — появился Быков. Я впервые наткнулся в школьном учебнике на прозу, которая пульсировала точь-в-точь в такт реальной жизни, моего понимания вещей — мерно, спокойно, как серце. Я начал потихоньку почитывать по-беларуски, где-то разочаровываясь, где-то восхищаясь, но пробирался наощупь все увереннее и увереннее.

В университете я столкнулся с еще одним феноменом. Блестящие люди, отличные преподаватели, элита — разговаривали по-беларуски. А некоторые делали это так виртуозно, что просто захватывало дух. Да что я говорю: сами послушайте Вечерку или Дэицевич — буквально потекут слюнки. Все это вызывало острую зависть и

досадный комплекс, уже не провинциальный, а национальный. С этого времени я старался в любой торжественной, значимой обстановке — конференциях, семинарах и даже на Дне рождения выступать или общаться по-беларуски. Однако все еще не рисковал нарываться в магазинах — после того, как одна продавщица, поперхнувшись, переспросила: "Какой-какой **кубочек**? Горбатый?!." В общем, повсеместное могущество русского все еще не подвергалось сомнениям.

Третьим и решающим ударом была **тарашкевица** в "Нашай Ніве" и фронтовских кругах. Европейское звучание, грациозные полутона и нюансы, исключительная пронзительность знаменитых мягких знаков, которая едва-едва проглядывает в русском, а по-польски уже неисправимо шипит,— поражали наповал. Беларуская мова зазвучала мощно, уверенно и мелодично, эти звуки, небесно акающие, дзеканьне и цеканье возникали в образах, играя, переливаясь, и весь строй речи получал какую-то щемящую прозрачность, которую невозможно передать по-русски. Это было потрясающе.

Даже сегодня я не могу определить какой из двух языков все-таки богаче, лучше, великолепнее. А вот какой ближе, теплее, роднее — знаю точно. Именно поэтому сейчас, мне просто приятно изъясняться на холодном, блестящем чужом языке, которым я владею как ювелирными побрякушками. А когда говорю по-беларуски — с одухотворенной дрожью звучит все мое существо. Это святое.

Итак, ясным снежным днем 20 ноября 1994 г. я поинтересовался у сокурсников и соседей по общажной комнате, не будут ли они против, вежливо попросил прощения у родителей — и, как ни в чем ни бывало, пачаў размаўляць.

## ЧТО БУДЕТ

Нам всем следует твердо понять: через 12-15 лет беларускай мовай будет пользоваться практически вся наша элита, культура, пол-науки и часть экономики. Это неизбежно. На бытовом уровне беларускость будет год от года все активнее отвоевывать позицию за позицией, человека за человеком. Об этом можно судить хотя бы по тому, что сегодня количественно ничтожная часть беларуского общества, разговаривающая на беларускай, играет огромную, а кое-где и определяющую роль в общественной жизни. Лидеры нации, самые мощные и активные деятели, представьте себе, беларускоязычны. Уже сейчас носители беларускай куда более активны, даже

сфере, они молоды и напористы

vytoki.net







***Беларускоязычные.***

в отличие от пассивного и пожилого русскоязычного "подавляющего большинства". Вы вспомните: всего 10 лет назад таких была горстка далеких от народа революционеров. Сейчас — десятки тысяч, преимущественно студентов и школьников. Мова стала моральным идеалом и жизненной позицией. Рано или поздно этот императив станет основой государственной политики.

Причем методы беларусизации, так пугавшие обывателей в начале 90-х, станут, по-видимому, уже иными. Не разнарядка, патетические заклинания и административное давление, а активная, зрелищная популяризация, разнообразие и качество информации, европейский стандарт, реформа системы образования и развитие неправительственной сферы.

На этот раз заставлять никто никого не будет. Есть такое понятие, как личное дело каждого. Это **ваше** дело, вашей совести, собственной внутренней гармонии и генетического чувства. К этому каждый должен прийти сам. Или, другими словами, **прийти в себя**.

Сдается: что и наша с вами любимая газета "Имя" сегодня имеющая лишь легкий беларуский акцент, лет эдак через 7–8 вооружится принципом: "Имидж — ничто. Мова — усё!"

С древности наша земля была Империей Культуры. Это родина величайших гениев литературы и искусства, музыки, науки и просвещения. Беларусь в перспективе — духовный, информационный и технологический центр Восточной Европы. Мы с вами должны почувствовать ту огромную ответственность, которая лежит на плечах сегодняшнего поколения молодых, на теперешней оппозиции,— ответственность за реализацию нашей **Национальной идеи**.

## КАК ЭТО ДЕЛАЕТСЯ

Для начала осмотритесь вокруг. Выделите в сфере вашей жизнедеятельности тех людей, те книги и реальные дела, которые могут вам помочь. Устроиться более ёмко, основательно среди всевозможных личных интересов, среди друзей и целей в жизни, скоординироваться в мире прежних ценностей — это значит сделать полдела. Этим вы приучите свои желания, увлечения и даже вредные привычки работать в принципиально беларуской конструкции. Один мой приятель не мог сесть поесть без хоть какой-либо газеты — так вот, я постоянно подсовывал ему в столовой то "Свабоду", то "Нашу Ніву", и в конце концов начал встречать его по редакциям и библиотекам за беларускими переводами литературных нобелей.

Начинать следует с проговаривания про себя или вслух своих мыслей, задач и планов, ёще лучше — самостоятельных переводов песенок и сложных выражений. Сосредотачивайтесь на тех беларуских словах и сочетаниях, которые звучат и воспринимаются более выразительно, впечатляюще, чем русские аналоги. Прочувствуйте, насколько "крок разам" лучше "шага вместе", а "рух" неизмеримо более ёмок, чем пресловутое "движение". Вместе с тем умейте признавать, что кое-где мова объективно уступает.

Огромное значение имеет молитва. Всё-таки Бог есть и, поверьте, Ему приятнее слушать вас именно по-беларуски.

Отличный способ проверить свою готовность — спор. Лучше с умным русскоязычным собеседником. К примеру, спонтанная стычка: язык, на котором следует разговаривать это классика переходного периода. Если вам удаётся хоть в чём-то убедить оппонента или впечатлить зрителей — считайте, что победа близка. Вообще же стоит основательно продумать свою защиту и нападение в вопросах беларускости. Это обязательно пригодится и к тому же систематизирует процесс вашей личной трансформации.

Через несколько недель после того, как вы начали, у вас появ-

vytoki.net





ляется мощный союзник. Глубинные генетические коды обоих полушарий мозга включаются в **подсознательную** борьбу за вашу беларускую. С этого момента процесс пойдёт вдвое быстрее. Вкус к родному маўленьню становится всё более ощутимым, пространственным, появляются всё новые вкусы и оттенки; русский язык, чувствуется, приелся. В этот период в трансе, гипнозе или, попроще, во сне вы можете думать и разговаривать по-беларуски. Естественно, останавливаться на достигнутом не стоит, успех требует дальнейшего развития. Если в этот период вовсе не упражняться в русском — не исключено, что начнёте разговаривать совсем как прибалты, с некоторой запинкой, припоминая штампы.

Это аксиома: язык мой — враг мой. На мове, прежде чем сказать, секунду подумаешь. И эта секунда очень часто спасает от многочего лишнего.

## ПРЕОДОЛЕНИЕ

Имейте в виду: с первых же шагов вам придётся столкнуться с весьма сильным внутренним сопротивлением. Всё начинается с непосредственного **старта** в отношениях с родными, одноклассниками и даже, страшно сказать, любимой девушкой. Примерно 7-10 дней вы испытываете одну и ту же неприятную, неудобную стыдливость. Выговаривание привычных слов превращается в театральную пытку. Не отступайте. Этот барьер каждый раз берётся с ходу. Ваша мова в 95% случаев вызывает положительную ответную реакцию. Это **им** становится стыдно, и большинство немедленно поддерживает ваш почин: "Ты знаешь, это здорово. Я б и сам, да вот всё как-то по-русски... А ты молодец. Давай."

Вот и давайте. В этом ваше психологическое превосходство. Вы сразу выделяетесь из толпы, подымаетесь над ней. Вы с первых слов производите впечатление интеллигентного, культурного, порядочного человека и заставляете окружающих по-иному, гораздо более уважительно, относится к себе. Каждый второй скажет вам об этом, каждый третий попытается размаўляць с вами по-беларуски. Словом, вы употребляете мову, а мова изменяет вас. Мова — это романтика, это то, во что хочется верить. А! Кстати, специально для любимой девушки: такие интимные словечки, как "зайка", "милая", "любушка", в беларускай также имеют место, а ёще есть и "каханачка", "ласачка", "зорачка", "таечка", "дзяўчынка мая", "ясачка", "красуня", "прыгажунечка" и тьма прочих, не менее нежных. У всех серьёзных, с кем я общался на эту тему, беларуская любовная речь пользу-

ется репутацией более тёплой, чувственной и трогательной. В общем, как резюмировал один мой знакомый компьютерщик, "возбуждает".

На этом этапе вам необходимо постоянное чтение, более-менее методичное живое общение, беларуская музыка и, желательно, аутотренинг.Из книг это, конечно, Василь Быков, Алесь Адамович, Максим Горецкий, Владимир Орлов — для тех, кто читает неторопливо, смакуя, философствуя. Владимир Короткевич, Максим Богданович и прекрасная беларуская поэзия — для людей эмоциональных, читащюх запоем, в порыве настроения или вдохновения. Музыка — беларуский рок ("Мясцовы час", "NRM", "Уліс"), фольк-рок ("Песьняры", "Песьнярок", "Камэлот"), фольк-техно ("Палац", "Крыві"), блюз-рок ("Крама", "Новае Неба"), барды (Шалкевич, Соколов-Воюш, Данчик, Мельников), дискотека ("Made in Belarus"; Ален, "Грунвальд", "Каня") и, конечно, "Народны альбом". Во всяком случае, это будет куда полезнее постоянного просмотра чёрного ящика с хронически резонирующим БТ и рекламным заиканием на российских телеканалах.

Вторая напасть — **прогрессивная трасянка**. Дьявольская штуковина. В быстрых разговорах, суете и сложных ситуациях возникает такое мгновенное подленькое желаньице выговариваться на двух языках сразу. Хищнический позыв — урвать, как кажется, самое лучшее, сочное и оттуда, и отсюда. Получается что-то вроде деревенского акцента, но с чудовищными цитатами. Аж до нервного смеха, до самых заумных извращений. Например, хочется с наслаждением передразнивать Президента. Барьер с виду пустяковый, однако он коварнее первого. Идея синтеза родственных языков навязчива, хотя и неестественна, вроде гомосексуализма. Чтобы справиться, придётся постоянно следить за чистотой речи и подтягиваться в присутствии авторитетов и спецов — тех, кому вы подражаете или хотите понравиться.

Наконец, барьер третий, великий и ужасный. Русская литература, кино, искусство, сам Русский Язык собственной персоной. Тут дело обстоит серьёзно. Чувство превосходства русского действительно способно повергнуть в панику. Не отчаивайтесь. Надо усвоить несколько основных вещей:

— Русская литература, музыка, искусство действительно великие, и не в последнюю очередь благодаря беларусам (от Грибоедова, Достоевского, Бунина, до Твардовского, Грина, Высоцкого, от Глинки и Стравинского до Шостаковича). В общем, это не вредно. Вредно [illegible] о и духовного человеческая цивилизация не создала.

vytoki.net





— Ближе, дороже, понятнее **своего собственного** ничего быть не может. Вот эта земля, которую видно из вашего окна, и есть ваша Родина. Вероятно, это придёт с годами, но чем раньше вы поймёте, тем лучше.

— Русский язык, на самом деле великолепно разработанный и освоенный, уже сто раз пережеван. Впечатление такое, что его развитие практически завершилось. Дальше некуда. Без притока живительной силы остаётся разлагаться на жаргоны, матерщину, канцелярщину, разрушаться в агрессивной среде иностранщины.Жизненное пространство русского, в отличие, например, от английского, стремительно сокращается. А вот беларуская мова, к тому же освежённая тарашкевицей, имеющая громадный внутренний и внешний потенциал, даёт свободу творчества для формирования языка куда более современного и совершенного. Уже сегодня — с компьютерной скоростью, с помощью новейших информационных технологий, с бурным прогрессом психологического и генетического знания.

— В конце концов, наши духовные ориентиры находятся в европейской культуре, к которой Беларуси суждено вернуться. Немецкая, французская, английская, итальянская, польская, испанская, чешская культуры пока ещё массово недоступны для нас — и именно их постижение, освоение, осмысление есть магистральный путь в единую Европу Отечеств.

* * *

Ну вот, теперь можно и приступать. Вспомните, что сегодня за дата, посмотрите на часы. Это для истории. И обратитесь к соседу (брату, маме, жене) с дословным переводом Глеба Жеглова,— для убедительности прищёлкнув пальцами и приняв подобающее выражение лица:

— А цяпер — гарбаты!

— ...?

— Я сказаў, гарбаты!

(Перевод автора.)

# КАЛЕКЦЫЯ БЕЛАРУШЧЫНЫ

Прыкладны сьпіс кнігаў, касэтаў і некалькіх збораў, якія трэба мець кожнай суполцы "Маладога Адраджэньня". Калі вы што кольвечы ня здолееце прыдбаць — зьвяртайцеся на адрэсы пазначаныя ў "Каталёгу", і замаўляйце зь Менску. У кожным нумары пададзеныя варыянты — выбірайце, але першыя лепей.

Калекцыя беларушыны — гэта самая прадукцыйная агітацыя за Беларусь. Давайце касэты паслухаць навічкам, знаёмцам, адукуйцеся самі, выкарыстоўвайце кнігі й падшыўкі ў выступах. Гэта — найважнейшы інфармацыйны багаж вашае рады ці суполкі.

## КНІГІ

Хаця б адна беларуская энцыкляпэдыя — "Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі", "Беларутэніка", "Энцыкляпэдыя прыроды Беларусі", "Францыск Скарына" і г.д.

Кніжкі сэрыі "Нашы славутыя землякі" (Касьцюшка, Семяновіч, Юркоўскі, Руцкі і інш.) — іх надрукавана больш за 20.

Кнігі сэрыі "Беларускі кнігазбор" (Ян Баршчэўскі, Адам Міцкевіч, Вацлаў Ластоўскі і г.д.)

Падручнік па гісторыі, прыкладам "Старажытная Беларусь" Ермаловіча, "Імя ў летапісе" Чаропкі, "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі" Ігнатоўскага, "Кароткая гісторыя Беларусі" Ластоўскага.

"Геаграфія Беларусі" Смоліча ці "Цячэ з-пад Сьвятое гары Нёман" Віцьбіча

"Памяць пра легенды", "Пагоня на Грунвальд" К.Тарасава

"Менская вясна - 96"/"Менская вясна - 97"

"Гарт. Саюз беларускіх патрыётаў", "Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста"

В.Быкаў — "Сотнікаў", "Жураўліны крык", "Знак бяды", "Сьцяна", "Дажыць да сьвітаньня"

У.Караткевіч — "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Каласы пад сярпом тваім", "Лісьце каштанаў", "Ладзьдзя роспачы", "Сівая легенда"

М.Багдановіч — "Вянок", ці "Выбранае", калі здабудзеце — трохтомны збор твораў

Я.Купала — "Спадчына", "Сон на кургане" ці "Поўны збор"

Я.Колас — "Сымон музыка", "Новая зямля"



vytoki.net



М.Гарэцкі — "Дзьве душы", "Цікая плынь", "Рунь"

У.Арлоў — "Божая кароўка зь пятай авэню", "Адкуль наш род", "Таямніцы полацкай гісторыі"

Н.Арсеньнева — "Пад сінім небам"

Л.Геніюш — "Споведзь"

Р.Барадулін, ці С.Сокалаў-Воюш, любыя зборнікі вершаў

Вершы Ніла Гілевіча, Алеся Разанава, Максіма Танка, Анатоля Сербантовіча, Алега Мінкіна.

Замежная літаратура (Джойс, Борхес, Пруст, Кафка, Лем, Набокаў, Рэмарк, Хэмінгуэй, По, Маркес, Шэксьпір, Сэрвантэс, Дантэ, у перакладах Яна Максімюка, Васіля Сёмухі, Алега Мінкіна, Язэпа Семяжона, Рамана Палкоўіча, Лявона Баршчэўскага)

Слоўнікі, ("Расейска-Крыўскі" Ластоўскага, "Невялічкі беларуска-маскоўскі" Гарэцкага, вялікі слоўнік С.Станкевіча, Насовіча), але ж зьбірайце што можаце.

Тарашкевіцкі правапіс, найлепш у рэдакцыі В.Вячоркі.

Беларускія: Біблія (пер. Сёмухі), Эвангельлі (каталіцкія, праваслаўныя, вуніяцкія, пратэстанцкія выданьні), Катэхізм.

## КАСЭТЫ

"Народны Альбом"

"Мроя" "Лепшыя песьні", "Маё біяполе"

"NRM" "Odzirydzidzina", "JaJaJaJaJa", "Made in NRM"

"Мясцовы Час" "Наша ўскраіна", "Мой дом", "Слота"

"Уліс" "Танцы на даху", "Краіна доўгай белай хмары"

"Палац" Палац'95, "Дарожка"

"Крама" "Хворы на рок-н-рол", "Гэй там, налівай!", "Камэндант"

"Камэлот" "Краіна талераў"

Данчык "Мы яшчэ сустрэнемся", "Мы адной табе належым"

"Новае Неба" "Выбранае"

"Made in Belarus"

Ален, "Бонда", Сокалаў-Воюш, Мельнікаў, Шалкевіч, "Рэнэсанс".

Клясычная беларуская музыка — Агінскі, Манюшка, Шастаковіч, Стравінскі, Глінка таксама запісы патрыятычных песьняў ("Магутны Божа", "Мы выйдзем шчыльнымі радамі", "У гушчарах", "Пагоня")

## ЗБОРЫ

Падшыўкі беларускіх газэтаў ("Нашай Нівы", "Свабоды")

"Спадчына" апошніх гадоў, "Фрагмэнты", "ARCHE".

Зборы паштовак — "Беларускі вайсковы строй і зброя", "Мірскі замак", "Беларуская кафля", іншыя, ды фотаальбомы, напрыклад, "Іканапіс Беларусі"

**Урэшце**, няблага мець відэакасэты зь "Менскай вясной", "Звычайным прэзыдэнтам", а таксама зь фільмамі, што добра ўплываюць на нацыянальны дух, дапрыкладу, той жа "Brave Heart"

vytoki.net





## КЛЮЧЫ

Павал Севярынец, старшыня МА. Менск.
Ідэі, праекты, найважнейшыя справы. Літаратура.
284-50-12 (т/ф), Віцебск: 21-45-31

Вітаўт Супрановіч, сябра Рады МА.
Арганізацыя канцэртаў, прад'юсарская дзейнасьць.
Распаўсюд касэтаў, кнігаў, значкаў и г.д.
249-08-88

Вольга Анцыповіч, сакратарка Рады МА.
Дакуманты, запрашэньні, прапановы.
249-92-47

Аляксей Янукевіч.
Міжнародная інфармацыя. Аналіз.
240-65-82

Натальля Маковік.
Адукацыйныя праграмы.
242-48-34

Аляксей Фралоў
Музыка, сьлевы. Дойлідзтва.
213-34-52

Максім Капран, Эла Мацьвіенка
Экалёгія
242-62-33

Андрэй Карповіч
Ды-джэй клюб. Дыскатэкі
250-51-19

Віталь Алесіёнак.
Філялёгія, літаратура.
251-90-62

Віталь Станішэўскі
Менск. Касэты.
240-78-01

## МЕНСКІЯ РАЁННЫЯ РАДЫ:

Ганна Каморнік.
Менск. Заводзкі раён.
241-80-29

Зьміцер Касьяровіч.
Менск. Савецкі раён.
232-54-58

Кірыл Камароўскі.
Менск. Фрунзэнскі раён.
258-99-66

Іна Грэбень.
Менск. Ленінскі раён.
249-60-67

Віталь Зыблюк.
Менск. Маскоўскі раён.
256-46-07

Міхась Лучына.
Менск. Першамайскі раён.
283-41-53

## РЭГІЁНЫ:

**Горадня (0152):**
Сяржук Антусевіч, сябра Рады
44-37-29
Андрэй Мялешка
22-61-21

**Магілеў (0222):**
Алесь Асіпцоў, намесьнік старшыні
25-57-85
Аляксей Бацюкоў
41-69-77

**Віцебск (0212):**
Міхась Доўгін
61-28-22

vytoki.net





**Берасьце (0162):**
Паліна Панасюк
42-28-11

**Барысаў (0277):**
Зьміцер Аскерка
5-02-66

**Наваполацак (02144):**
Зьміцер Салаўёў
5-01-16
5-27-02
Андрэй Мацук
2-52-15

**Ліда (01561):**
Артур Ганько
2-52-15

**Слонім (01562):**
Алесь Масюк
3-14-93

**Орша (02161):**
Алег Граблеўскі
4-28-57

**Маладэчна (0273):**
Сяргей Юркевіч
3-36-60

**Мар'іна-Горка (0213):**
Уладзя Жайняк
4-34-56

**Баранавічы (01634):**
Алесь Пікула
5-90-92

**Салігорск (0210):**
Андрусь Лапановіч
4-45-78

## 2. МАЛАДЫ РОК-ФРОНТ

| | | |
|---|---|---|
| NRM | Піт Паўлаў | 236-90-27, 237-43-11 |
| Крама | Клаўс | 240-15-13 |
| | Ігар | 245-98-98 |
| Уліс | Слава Корань | 213-34-95 |
| Новае Неба | Кася Камоцкая | 266-31-16 |
| Месцовы Час | Алесь Кузьмін | (02144) 3-14-57 |
| Нейро Дюбель | Аляксей | 276-93-88, 263-92-28 |
| Палац, Крыві | Юра | 259-75-19 |
| | Зьміцер | 271-67-65, 277-53-86 |
| Камэлот | Ігар | 213-95-56 |
| Зьніч | Дзяніс | 264-77-78 |
| | Зьміцер | 269-50-21 |
| Жыгімонт Ваза | Сяргей | 227-42-32 |
| God's Tower | Віктар Лапіцкі | (0232) 45-35-67 |
| Exist | Юрась | 275-29-15 |
| Deviation | Стас, Андрэй | (0152)31-30-46 |
| Ален | | (02144) 7-12-43, 5-57-89 |
| Гай | Міхал | 258-79-09, 223-07—09 |
| Алесь Камоцкі | | 237-35-22 |
| Ліцьвіны | Уладзімер | 236-52-78 |
| Зьміцер Бартосік | | 227-78-92 |
| Віктар Шалкевіч | | (0152) 39-90-19 |
| Сонца Мао | Паўлюк | 248-79-94 |
| Млын | Андрэй | 250-51-19 |
| Сяржук Мінскевіч | | 246-82-36 |
| Троіца | Дзіма | 271-13-52 |
| Андрэй Мельнікаў | | (0232) 54-30-40, (0216) 12-00-74 |
| Эдуард Акулін | | 220-62-13 |
| Tornado | Гена | 232-90-03 |
| Vicious Crusade | Дзіма | 262-33-43 |
| Склеп | Дзяніс | 275-69-37 |
| Гнілыя Гарбузы | Ільля | 243-68-66 |
| Грунвальд | Аніса | (02144) 50-189 |
| Інтэльмадыя | Руслан | 248-47-42 |
| Кальян | Саша | (0152) 47-87-26 |
| [illegible] | [illegible] | 8-104885531519 |
| | | 273-14-65 |

vytoki.net





| | | |
|---|---|---|
| Ветэран Скрэпэр | Ігар (Ганс) | (02144) 55-777 |
| Барадаты Грыневіч | Вадзім | 261-33-98 |
| Капішча | Вадзім | (0162) 42-37-80 |
| Карысныя выкапні | Каця | 263-19-28 |
| Новае касьмічнае места | Яўген | (0212) 911-693, 911-603 |
| Айша | Сяргей | (0152) 33-14-26 |
| Грамада | Генік | 8-104885743352О |
| Ляваны | Павал | 235-29-25 |
| Правакацыя | Алег | 244-39-90 |
| Сьвята | Вячаслаў | 223-35-17 |
| хор "Унія" | Кірыл | 236-54-01 |
| Hasta la filista | Дзіма | 237-76-21 |
| Happy face | Сяргей | 261-16-78 |
| Лера Сом | | (02144) 63-591 |
| Алмазны фронт | Эдуард | (0212) 61-41-25 |
| Уладзімер Клімовіч | | 232-51-80 |
| Марыя Скуратовіч | | 265-22-23 |
| Уладзімер Гуткоўскі | | 236-77-90 |
| Сяржук Сокалаў-Воюш | | 231-16-17 |
| "Narodny Albom" | Міхал | 276-92-05, 226-61-87 |

## 3. АДРЭСЫ, ЯКІЯ ВАМ СПАТРЭБЯЦЦА

**МАЛАДЫ ФРОНТ**

Павал Севярынец 284-50-12 (пн., чц.)

Аляксей Янукевіч 240-65-82, 246-04-21

Яўген Скочка 236-24-37

**БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ФРОНТ**

Управа 284-50-12, 213-30-08

**ТБМ**

Людміла Дзіцэвіч 238-89-73

**ТБШ**

Алесь Лозка 232-47-01

Алесь Садзяка 248-32-02

**"НАША НІВА", БЕЛАРУСКІ ГУМАНІТАРНЫ ФОНД**

Віталь Ханзскі 229-55-96

**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ**, Упраўленне па справах грамадскіх аб'яднанняў

220-89-00, 220-40-51

**БЕЛАРУСКІ ГЕЛЬСЫНСКІ КАМІТЭТ**
222-48-00, 220-48-01

Праваабарончы камітэт **"МЕНСКАЯ ВЯСНА'96"**
239-31-17

**АБСЭ**
229-08-34, 227-29-12 (ф)

**ЗАДЗІНОЧАНЬНЕ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ**
232-27-43

**БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА**
Сяргей Сахараў 229-55-96

Цэнтар **"СУПОЛЬНАСЬЦЬ"**
237-37-38

Беларускі Жаночы Рух **"ЗА АДРАДЖЭНЬНЕ АЙЧЫНЫ"**
Тацьцяна Ваніна 259-64-51

**АСАМБЛЕЯ НЯЎРАДАВЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ**
220-73-74

## ПРЭСА:

| | | |
|---|---|---|
| БелаПАН | Генадзь Барбарыч | 232-75-48 |
| Associated Press (USA) | Марына Бабкіна | 235-42-32 (хатні) |
| BBC (Britain) | | 276-66-84 |
| DPA (Deutschland) | Тацьцяна Шэбет | 227-96-38 |
| ИТАР ТАСС (Russia) | | 222-15-54 |
| Радыё "Свабода" | Аляксей Янукевіч | 240-65-82 |
| Радыё 101.2 | Вольга Караткевіч | 229-21-61, 229-22-62 |
| Радыё "Бі-Эй" | | 236-15-03 |
| НТВ | | 234-88-82 |
| Навіны (Свабода) | | 236-20-83 |
| Народная Воля | | 229-28-71 (т/ф) |
| Имя | Ірына Халіп | 278-11-01 аб. 3453 |
| Белорусская Деловая Газета | | 236-53-62 |
| Белоруская газета | | 223-26-40 |
| Беларуская Маладзёжная | Тацьцяна Мельнічук | 220-98-04 |
| Наша Слова | | 233-17-83 |
| Спадчына | | 234-26-50 |
| Пагоня | | (80152) 72-29-96 (Горадня) |
| Наша Ніва | Севярын Квяткоўскі | 227-78-92 |



vytoki.net

# ЗБОРЫ БЕЛАРУШЧЫНЫ. ДЫ-ДЖЭЙ АДРАДЖЭНЬНЯ

© Маладое Адраджэньне
Павал Севярынец
Аляксей Чарняеў
Вітаўт Супрановіч

© Макет, Аляксей Чарняеў;
набор і тэхнічная падтрымка:
Аляксей Чарняеў,
Аляксей Трушкевіч

**Нашыя шчырыя падзякі:**

Марыне Агібалавай, Вользе Анцыповіч, Яўгену Афнагелю, Зьміцеру Бандарэнку, Пятру Варахобіну, Андрэю Вашкевічу, Ульляне Вішнеўскай, Аляксею Галічу, Іне Грэбень, Віктару Жагуню, Хведару Жывалеўскаму, Віталю Зыблюку, Раману Кавальчуку, Кірылу Камароўскаму, Ганьне Каморнік, Вадзіму Канапацкаму, Максу Капрану, Андрэю Карповічу, Зьміцеру Касьпяровічу, Вадзіму Лабковічу, Натальлі Маковік, Алесю Марковічу, Эле Мацьвіенцы, Алесю Міхалевічу, Сяргею Навумчыку, Зянону Пазьняку, Эме Паўловіч, Андрэю Пятрову, Сяргею Сахараву, Вячаславу Сіўчыку, Яўгену Скочку, Кірылу Тананушку, Аляксею Фралову, Алене Хадасевіч, Вітаўту Ханэцкаму, Аліне Шалінай, Алесю Шыпко, Уладзімеру Юхо, Аляксею Янукевічу.

Асаблівая падзяка МАЛАДОМУ ФРОНТУ,
а таксама БНФ, БГФ “Наша Ніва”, NRM ды ўсім
салідным бабрам.

vytoki.net